*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 ЧЭРВЕНЯ 2007 г. СУБОТА

№ 106 (25971)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Павялічаны памеры ўсіх аднаразовых дапамог пры нараджэнні дзяцей

У Беларусі з 1 чэрвеня павялічаны памеры ўсіх аднаразовых дапамог пры нараджэнні дзяцей. Кіраўнік дзяржавы 8 чэрвеня падпісаў Указ №268, накіраваны на ўзмацненне дзяржаўнай падтрымкі сем'яў пры нараджэнні дзяцей.

Так, памер аднаразовай дапамогі пры нараджэнні першага дзіцяці павялічваецца з двух да пяці бюджэтаў пражытковага мінімуму, пры нараджэнні другога — з двух, а трэцяга і наступных дзяцей — з трох да сямі бюджэтаў пражытковага мінімуму.

Пры дзеючым цяпер памеры бюджэту пражытковага мінімуму велічыня дапамогі складзе адпаведна Br924 тыс. і Br1,293 млн.

Такая мера накіравана на павышэнне ўзроўню матэрыяльнай падтрымкі сем'яў у сувязі з нараджэннем дзяцей, стымуляванне нараджальнасці, захаванне тых станоўчых тэндэнцый, якія склаліся ў апошнія гады ў гэтай галіне. Акрамя таго, указам устараняецца дыферэнцыяцыя памеру аднаразовай дапамогі жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, калі жанчына, якая нарадзіла першае або другое дзіця, атрымлівала такую дапамогу ў меншым памеры, чым жанчына, якая нарадзіла трэцяе дзіця і наступных дзяцей. Паколькі галоўная мэта гэтай дапамогі — стымуляваць жанчын станавіцца на ўлік у жаночых кансультацыях у раннія тэрміны цяжарнасці, пастаянна наглядацца ў спецыялістаў, каб пазбегнуць ускладненняў, указам гэта дапамога ўстаноўлена ў памеры бюджэту пражытковага мінімуму для ўсіх маці незалежна ад чарговасці нараджэння дзіцяці.

Павелічэнне памеру дапамог жанчынам — адна з мераў дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, што рэалізуюцца ў бягучым годзе, які аб'яўлены ў рэспубліцы Годам дзіцяці, а таксама ў наступныя гады.

## Прэзідэнт Беларусі паставіў перад банкамі задачу зніжаць кошт крэдытаў

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу забяспечыць па выніках першага паўгоддзя і 2007 года ў цэлым выкананне паказчыкаў, закладзеных у Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на бягучы год. Аляксандр Лукашэнка 8 чэрвеня 2007 года прыняў з дакладам старшыню праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча.

Кіраўніку дзяржавы было далажана, што банкаўская сістэма Беларусі ў гэтым годзе паспяхова выконвае запланаваныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі. Пры гэтым асаблівая ўвага ўдзяляецца тым паказчыкам, якія непасрэдна ўплываюць на дасягненне прагнозных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Аляксандр Лукашэнка быў праінфармаваны аб тым, што сітуацыя ў фінансавай сферы стабільная. Курс беларускага рубля адносна долара ЗША на працягу года скараціўся на 0,2 працэнта, пры гэтым за май ён не змяняўся і на 1 чэрвеня склаў Br2145 за долар ЗША. Такая стабільнасць захоўваецца ўжо на працягу апошніх трох гадоў.

Пётр Пракаповіч таксама паведаміў, што ў гэтым годзе банкаўская сістэма аказвае беспрэцэдэнтную крэдытную падтрымку рэальнаму сектару эканомікі. За 5 месяцаў 2007 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2006 года аб'ём прадастаўленых банкамі крэдытаў вырас больш як у 1,6 раза і дасягнуў амаль Br24 трлн. Гэта больш як у 2 разы перавышае паказчыкі, закладзеныя ў Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на гэты год. Такімі ж паскоранымі тэмпамі нарошчваецца і крэдытаванне насельніцтва. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў і ў далейшым асаблівую ўвагу ўдзяляць крэдытаванню рэальнага сектара эканомікі, забяспечваючы пры гэтым паступовае зніжэнне кошту крэдытных рэсурсаў.

Кіраўнік дзяржавы ў ходзе рабочай сустрэчы таксама падкрэсліў неабходнасць паскорыць тэмпы папаўнення золатавалютных рэзерваў краіны. Раней прадугледжвалася нарасціць рэзервы да $3 млрд да 2011 года. Прэзідэнт паставіў задачу выйсці на гэта значэнне ўжо ў гэтым годзе, каб гарантаваць стабільнасць фінансавай сістэмы. На 1 чэрвеня гэтага года золатавалютныя рэзервы Беларусі ў нацыянальным вызначэнні склалі $2,224 млрд. З пачатку года яны павялічыліся на $470 млн. Гэта на $70 млн вышэй за верхнюю мяжу прагнознага паказчыка на год.

## Беларусь удзячна Кітаю за магчымасць перадалімпійскіх трэніровак нашых спартсменаў

Беларусь вельмі цікавіць вопыт Кітая ў падрыхтоўцы спартсменаў да Алімпійскіх гульняў. Аб гэтым заявіў 8 чэрвеня Прэзідэнт Беларусі, прэзідэнт НАК краіны Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы са старшынёй (міністрам) Галоўнага дзяржаўнага ўпраўлення фізічнай культуры і спорту КНР, прэзідэнтам Алімпійскага камітэта Кітая Лю Пэнам.

«У вас неймаверны прагрэс ў развіцці спорту, у дасягненні тых мэтаў, якія вы ставіце перад спартсменамі літаральна па ўсіх відах. Сёння мы ў вас павінны вучыцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да кіраўніка Алімпійскага камітэта Кітая.

Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку за прадастаўленую магчымасць правядзення перадалімпійскіх трэніровак беларускіх спартсменаў па 12 відах спорту на тэрыторыі Кітая сумесна з кітайскімі спартсменамі. «Гэта ўнікальная магчымасць. Вы пайшлі на тое, каб адкрыць дзверы і дапусціць нашых спартсменаў у «святая святых» — да методыкі падрыхтоўкі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што Кітайская Народная Рэспубліка апошнім часам аказвае Беларусі немалую падтрымку ў сферы эканомікі. «Мы бачым дынаміку развіцця гэтай падтрымкі. Кітайскі бок вельмі актыўна прыйшоў у нашу эканоміку, прадастаўляе танныя крэдыты», — адзначыў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы перадаў кіраўніцтву КНР самыя добрыя пажаданні здароўя і працвітання краіне. Аляксандр Лукашэнка ўручыў прэзідэнту Алімпійскага камітэта Кітая Лю Пэну ордэн Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі. Гэтай узнагароды Лю Пэн удастоены за заслугі ў развіцці алімпійскага руху, за ўклад у беларуска-кітайскае спартыўнае супрацоўніцтва.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



Жыхары г.п. Смілавічы Франц і Наталля ЯНКОЎСКІЯ з усімі сваімі выхаванцамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# «ШМАТДЗЕТНЫ» ДВОР

## ПЛАНУЕЦЦА, ШТО ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПРЫМЕ ЎДЗЕЛ У НЕФАРМАЛЬНЫМ САМІЦЕ КІРАЎНІКОЎ ДЗЯРЖАЎ СНД У САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, як чакаецца, 10 чэрвеня прыме ўдзел у нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў СНД у Санкт-Пецярбургу. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## РАБОЧАЯ ПАЕЗДКА НА ВІЦЕБШЧЫНУ

**У пятніцу Віцебскую вобласць наведаў прэм'ер-міністр рэспублікі Сяргей Сідорскі.**

На працягу дня Сяргей Сідорскі азнаёміўся з работай прыватнага вытворчага прадпрыемства «Пастаўскі мэблевы цэнтр». Тут ёсць чаму павучыцца і што паказаць. Былі абмеркаваны нюансы арганізацыі на сучасным узроўні вытворчасці па апрацоўцы драўніны. Дарэчы, гэтая фірма актыўна займаецца дабрачыннасцю, дапамагла адрамантаваць бальніцу і паліклініку ў райцэнтры, а зараз робіць многае, каб дзіцячае аддзяленне гэтай медыцынскай установы адпавядала лепшым еўрапейскім узорам. А яшчэ фінансуецца футбольная каманда.

На Пастаўшчыне прэм'ер таксама азнаёміўся з арганізацыяй турызму на базе знакамітага СВК «Навасёлкі-Лучай», дзе створаны вельмі цікавы турыстычны цэнтр «Салаўіны гай». Тут і страусаў, і фазанаў можна ўбачыць, паесці ў кафэ экалагічна чыстыя стравы. Дзесяткі турыстаў штодзень прыязджаюць у «гай», што побач з трасай на Літву.

У Глыбоцкім раёне разглядаліся пытанні нарыхтоўкі кармоў і падрыхтоўкі зернесушыльнай гаспадаркі да жніва...

А ў Віцебску ў цэнтры ўвагі стаў канцэртны комплекс Летні амфітэатр. Галоўную канцэртную пляцоўку міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» цяпер упрыгожвае дах, павялічыліся плошча сцэны і колькасць месцаў для гледачоў, якіх цяпер зала аднačасова змяшчае больш 6,2 тысячы. На гэтым аб'екце завяршаецца 1-я чарга рэканструкцыі. Аб тым, што зроблена, расказалі кіраўніку ўрада кіраўнікі міністэрстваў культуры і архітэктуры і будаўніцтва.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Тваё правы

# Правілы прыёму... на работу

**Статыстыка сведчыць, што кожны год змяняюць месца працы або ўладкоўваюцца ўпершыню сотні тысяч грамадзян Беларусі. Між тым, таксама не сакрэт: прыём на работу мае пэўныя нюансы. З якога і да якога ўзросту «дазваляецца» працаваць, калі ў наймальніка ёсць падставы адмовіць ад месца, наколькі важнай у дадзеным выпадку з'яўляецца наяўнасць прапіскі, ці забаронена прымаць на поўную стаўку студэнтаў дзённых аддзяленняў, а таксама якія існуюць патрабаванні да сумяшчальнікаў? Аб усім гэтым і іншым — наша сённяшняя гутарка з начальнікам юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Інэсай Мечыславаўнай ЧЫСЦЯКОВАЙ.**

### «Верхняя планка» практычна без межаў

Зразумела, першае, на што звяртае ўвагу наймальнік — узрост прэтэндэнта на вакансію. Паводле заканадаўства, працоўны дагавор можа быць заключаны з асобай, якой ужо споўнілася 16 гадоў. Разам з тым не выключаецца варыянт уладкавання і больш маладога чалавека. Аднак толькі на работу ў вольны ад навучання час і толькі з пісьмовай згоды аднаго з бацькоў. Да таго ж таксама важнае патрабаванне — сама работа непаўналетняга не павінна перашкаджаць яго навучанню і наносіць урон для здароўя.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

11 чэрвеня 2007 года ў 16.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу сёмая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПАСВЯЖЭЕ ТОЛЬКІ Ў ПАНЯДЗЕЛАК

**У гэтыя выхадныя захаваецца цёплае, даволі камфортнае надвор'е, паведаміла рэдакцыі галоўны сінаптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.**

Сёння ўдзень чакаецца сонечнае надвор'е, толькі месцамі ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях магчымыя кароткачасовыя дажджы або нават невялікія навальніцы. Тэмпература паветра будзе вагацца ад 24 градусаў на поўначы да 30 цяпла на поўдні краіны. У нядзелю невялікія дажджы з навальніцамі магчымыя ўжо ў асобных раёнах на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Тэмпературы паветра ўначы — 10—16 градусаў, удзень — 22—27, у паўднёвай частцы краіны да 30 градусаў цяпла.

У панядзелак услед за перамяшчэннем атмасфернага фронту стане ўжо халадней. Месцамі чакаюцца навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўдзень ужо 18—24, толькі ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях да 28 градусаў. Згодна з папярэднімі падлікамі сінаптыкаў, кароткачасовыя дажджы лакальнага тыпу будуць турбаваць нас амаль увесь тыдзень. Тэмпературы паветра ўначы — 9—15. А вось дзённая тэмпература пачне павышацца і ўжо ў сераду стане зноў 23—28 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### «СУХАЯ» СУБОТА...

**У дні выпускных у рэспубліцы будзе дзейнічаць забарона на рэалізацыю спіртных напояў**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Алег Слепчанка, у Мінску, Гомелі, Брэсце з шасці гадзін вечара сённяшняга дня і да васьмі гадзін раніцы ў нядзелю забаронена прадаваць спіртныя напоі і піва. Абмежаванні на продаж алкаголю ўведзены і ў іншых рэгіёнах краіны.

Гэтае рашэнне, паводле слоў Алега Слепчанкі, прынята мясцовымі выканкамамі па ініцыятыве тэрытарыяльных органаў унутраных спраў і накіравана на папярэджанне правапарушэнняў у стане алкагольнага ап'янення. Сёлета ў святочных урачыстасцях прымуць удзел больш за 100 тысяч выпускнікоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### «ВАСЬМЁРКУ» ЗАМЕНІЦЬ «НУЛЬ»

**Другім этапам прывядзення тэлефоннай нумарацыі Беларусі да міжнародных стандартаў стане адмова ад традыцыйнай «васьмёркі» пры выхадзе на міжгароднюю і міжнародную сетку. Замест «васьмёркі» мы будзем набіраць, як прынята ва ўсім свеце, «0» ці «00».**

Нагадаем, што з 31 сакавіка беларусы адмовіліся ад набору нулёў у нумарах даведачных службаў. Перайсці на новы парадак выхаду на міжгарад і міжнародную сетку плануецца не пазней, чым у 2008 годзе, — паведамілі журналісту «Звязды» ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Белтэлекам».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### КЛУБНІЦЫ СЁЛЕТА ПАЙШЛІ РАНЕЙ

**Сёлета Лунінецкае раённае спажывецкае таварыства плануе нарыхтаваць ад насельніцтва 900 тон клубніц, асноўная маса якіх пойдзе на прамперапрацоўку, паведаміла «Звяздзе» эканаміст Аксана Сайко.**

Гэта, дарэчы, істотна больш, чым было фактычна нарыхтавана летась, — амаль 622 тоны. У мінулым годзе пачатак чэрвеня быў не надта спякотным, прынамсі, першыя клубніцы ў раёне пачалі нарыхтоўваць ужо ў 20 чыслах першага летняга месяца. Сёлета ж, з улікам надвор'я, што ўсталявалася, першыя закупкі ў раённым спажывецкім таварыстве плануюць распачаць ужо ў пачатку наступнага тыдня. Праўда, як заўважыла Аксана Пятроўна, закупачныя цэны пакуль яшчэ не вызначаны. Зразумела, першая салодкая ягада ўжо пайшла, але людзі, імкнучыся атрымаць максімальны прыбытак, вязуць яе на рынкі. У Лунінецкім раёне рознічная цана за кілаграм клубніц складае 2,5—3 тысячы рублёў, хоць, як заўважыла Аксана Сайко, многія з мясцовых яе самі яшчэ фактычна не каштавалі як след. У сталіцы на рынках за апошнія дні клубніц стала непараўнальна больш, і цэны на ягаду папаўзлі ўніз. Днямі на Камароўцы, скажам, яе прапаноўвалі ўжо па 4—5 тысяч рублёў за кілаграм.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СЕЎ У ТАКСІ, А НА ЛІЧЫЛЬНІКУ ЎЖО 4950

**З 6 чэрвеня ў сталіцы ўводзіцца абаніраванне на паслугі легкавых таксі, якое прадугледжвае мінімальную аплату за карыстанне гэтым відам транспарту ў памеры 4950 рублёў. Зрэшты, канкрэтным перавозчыкам гэта новаўвядзенне для сталічных пасажыраў можа быць зроблена і крыху пазней, хоць тэхнічна на настройку лічыльніка патрабуюцца лічаныя секунды, паведамілі журналісту «Звязды» ў транспартнай асацыяцыі «Сталічнае таксі».**

Дарэчы, новаўвядзеннем абаніраванне на паслугі легкавых таксі будзе толькі для мінчан, паколькі такая сістэма ўжо выкарыстоўваецца ў Брэсце і Віцебску, ды і ва ўсім свеце.

— Ініцыявалі абаніраванне самі перавозчыкі, каб скараціць колькасць халастых прабегаў. Скажам, таксіст працуе з дыспетчарам, гадзіну стаіць у чарзе, нарэшце атрымлівае заказ, а кліент просіць падвезці, умоўна кажучы, да суседняга пад'езда. Вадзіцель атрымлівае мінімум грошай за аказаную паслугу і мусіць зноў стаць у чаргу ў чаканні заказу, — патлумачылі нам. — Таму цяпер адразу пры пасадцы ў таксі на лічыльніку будзе высвечвацца лічба 4950 рублёў. У дадзеную суму ўключана аплата за падачу таксі ў памеры 1100 рублёў і кошт прабегу 3,5 кіламетра па цане 1100 рублёў за кіламетр. Гэтая лічба не будзе змяняцца на лічыльніку, пакуль таксі не пройдзе 3,5 кіламетра, далей пойдзе адлік фактычнага прабегу, за які ўрэшце кліент і будзе плаціць.

«А калі чалавеку трэба праехаць менш за гэтыя 3,5 кіламетра, ці будзе яму вернута розніца?» — цікаўлюся ў спецыялістаў.

— Не, паколькі гэта і ёсць мінімальная аплата за карыстанне паслугамі таксі. Калі вы думаеце, што ад новаўвядзення пацерпіць шмат людзей, дык гэта не так. Згодна са статыстыкай, колькасць паездак на адлегласць менш за 3,5 кіламетра складае ўсяго 10—15 працэнтаў ад агульнай колькасці. Сярэдняя ж працягласць па Мінску, як мы падлічылі, звычайна роўная 7 кіламетрам.

Пытаюся, ці трэба будзе зараз кліенту рабіць перадаплату.

— Вадзіцель таксі можа патрабаваць ад кліента перадаплату і зараз — зыходзячы з канкрэтнай сітуацыі. Але звычайна пасажыр разлічваецца ў канцы паездкі, так што ўведзенае абаніраванне на паслугі таксі на гэта ўплыву не акажа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**ОАО «Купалинка» г. Солигорск (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

проводят открытый аукцион по продаже изолированного помещения, об. пл. – 2586,1 кв.м, начальная цена – 963 185 405 белорусских рублей с НДС расположенного по адресу: Солигорский район, Метявичское шоссе, 5. Задаток в размере 5% от начальной цены лота и перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18 июня 2007 г.** в 14.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Заслонова, 58, к. 510 (зал заседаний). Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15 июня 2007** года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

**Телефон (8017) 224-61-34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

**УП «Минский городской центр недвижимости» (продавец) совместно с ИМНС по Ленинскому району г. Минска**

проводят открытый аукцион по продаже здания градирни ОАО «Камволь», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, общей площадью 136,6 кв. м. Начальная цена составляет 23 598 330 рублей. Отвод земельного участка будет произведен Минской городской землеустроительной и геодезической службой. Объект продается без условий. Задаток в размере 10% от начальной цены и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин перечисляются на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Аукцион состоится 10 июля 2007 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления и необходимые документы принимаются по 9 июля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса 39, комн. 6.

**Контактные телефоны: 227-40-22, 227-48-36.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕЎРАПЕЙСКІЯ ЧЫНОЎНІКІ ПРЫЗНАЛІ ІСНАВАННЕ ТУРМАЎ ЦРУ

**Высокапастаўленыя супрацоўнікі польскіх і румынскіх службаў бяспекі пацвердзілі прадстаўнікам Савета Еўропы, што на тэрыторыі гэтых краін дзейнічалі спецыяльныя турмы ЦРУ, дзе ўтрымліваліся асобы, якіх падазравалі ў тэрарызме. Як адзначае The Guardian, якая мае копію справаздачы Савета Еўропы, гэта прызнанне ідзе ўразрэз з афіцыйнымі заявамі ўрадаў Польшчы і Румыніі, якія адмаўлялі наяўнасць такіх турмаў.**

Паводле сцвярджэнняў неназваных супрацоўнікаў спецслужбаў, ніхто са зняволеных гэтых турмаў не меў права звярнуцца ў Чырвоны Крыж, а да некаторых з іх прымяняліся так званыя «актыўныя метады дазнання». У справаздачы таксама прыводзіцца апісанне турэмных працэдур і распарадку і нават называюцца некаторыя імёны зняволеных. Акрамя таго, было ўстаноўлена, што праз некалькі тыдняў пасля падзей 11 верасня 2001 года, НАТА падпісала з ЗША пагадненне, згодна з якім грамадзянскім самалётам, якія выкарыстоўвала ЦРУ для транспарціроўкі затрыманых, дазваляўся бесперашкодны пралёт над тэрыторыямі краін — удзельніц альянсу.

### ДЖОРДЖУ БУШУ НА САМІЦЕ «ВЯЛІКАЙ ВАСЬМЁРКІ» СТАЛА ДРЭННА

**У прэзідэнта ЗША Джорджа Буша ў апошні дзень саміта «васьмёркі» ў нямецкім Хайлігендаме пагоршылася самаадчуванне: паводле інфармацыі адных крыніц, у гаспадара Белага дома выявіліся праблемы са страўнікам, іншых — ён крыху прастудзіўся. За здароўем прэзідэнта назірае асабісты ўрач.**

Інфарм-агенцтвы са спасылкай на прэс-сакратара Белага дома Дэна Бартлета паведамілі, што Буш перарваў свой удзел у сустрэчах. У сваю чаргу прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі пасля сустрэчы з амерыканскім калегам адзначыў, што Буш адчуў недамаганне раніцай у пятніцу і адновіць удзел у рабочых сустрэчах, «як толькі зможа».

Цікава, што ўчора на пасяджэнні ніжняй палаты расійскага парламента праблему слабасці прэзідэнта ЗША закранулі мясцовыя палітыкі. Натуральна, аўтарам самай яркай заявы стаў лідар ЛДПР Уладзімір Жырыноўскі. «Увогуле характар сустрэчы паказвае, што Буш нават сабе піва наліць не можа. Што гэта за прэзідэнт краіны, які сам сабе піва наліць не можа? Увесь абрус там заліў. Гэта значыць — не ўмее разлічваць, — чалавек слабы. Сапсаваў нямецкі рэстаран», — сказаў Жырыноўскі.

### ЕЎРАПАРЛАМЕНТ МОЖА АБМЕЖАВАЦЬ ХУТКАСЦЬ УСІХ НОВЫХ АЎТАМАБІЛЯЎ

**Еўрапейскі парламент ужо ў чэрвені гэтага года збіраецца разглядзець дакумент, які прадугледжвае ўвядзенне ў Еўропе забарону на выпуск аўтамабіляў, максімальная хуткасць якіх перавышае 101 мілю ў гадзіну (162 кіламетры ў гадзіну). Галасаванне па гэтаму законапраекту ў Еўрапарламенце пройдзе восенню.**

Паводле слоў прыхільнікаў такой нечаканай забароны, яе ўвядзенне дазволіць істотна скараціць выкіды шкодных рэчываў у атмасферу: для таго, каб разагнацца да 160 км у гадзіну, не патрэбны магутныя маторы, а значыць іх можна будзе зрабіць больш эканомнымі і экалагічнымі. Яшчэ адзін важкі аргумент з боку прыхільнікаў забароны хуткіх машын заключаецца ў тым, што ў большасці краін Еўропы максімальная хуткасць руху і так абмежавана на адзнацы 120—140 кіламетраў у гадзіну. За выключэннем Германіі. Адзінае «але», якое адзначаюць эксперты ў гэтым незвычайным дакуменце, — усе сучасныя аўтамабілі лёгка разганяюцца да 160 км у гадзіну. Таму гэтыя аўто ці аўтаматычна трапяць пад забарону, ці аўтавытворцам давядзецца ўстанаўліваць на іх электронныя абмежавальнікі хуткасці.

ISSN 1990 - 763X

07106>

9771990763008

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасу **220013 Мінск, вул.Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, мікрахвалевую печ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 2 ліпеня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 ліпеня 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 ліпеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 верасня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку печы СВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 5 чэрвеня 2007 года. Удачы ў гульні!**

**3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ на III кв. або II паўгоддз. 2007 года

Хатні адрас і тэлефон [ ] ____________________
(індэкс)

____________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету [ ] (індэкс выдання)

**ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Колькасць камплектаў [ ]

на 2007 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды ____________________
(паштовы індэкс) (адрас)

Каму ____________________
(прозвішча, ініцыялы)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету [ ] (індэкс выдання)

| ПВ | месца | літар |
|---|---|---|

**ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ________ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ________ руб. | | |

на 2007 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды ____________________
(паштовы індэкс) (адрас)

Каму ____________________
(прозвішча, ініцыялы)

Актуальна!

# ЛЕТА З «БЕЛПОШТАЙ» — ГЭТА НАДЗЕЙНА

**Так павялося — чым вышэй падымаецца слупок тэрмометра, тым часцей чуваць (прынамсі ў гарадах): «Ты калі ў водпуск?», «А куды?»...**

Адпаведна — паступова, пакрысе пачынаюць пусцець кабінеты і цэхі, пакавацца чамаданы. І, зразумела ж, узнікае мноства пытанняў, у вырашэнні якіх могуць паспрыяць спецыялісты РУП «Белпошта». Што заканамерна... Калі ведаць, што ў краіне каля чатырох тысяч аддзяленняў паштовай сувязі і што яны аказваюць зараз каля 40 відаў паслуг. Як традыцыйных для сябе, так і не вельмі. Хоць для кліента ўжо і прывычных.

— Куды б на тэрыторыі нашай краіны чалавек ні паехаў, дзе б ні адпачываў, куды б ні адправіў на аздараўленне сваё дзіця, хай ведае, што пошта заўсёды блізка, — падкрэсліла падчас прэс-канферэнцыі «Лета з «Белпоштай...» начальнік упраўлення паштовых тэхналогій і лагістыкі Валянціна МАЛІНОЎСКАЯ. — У любы куточак (і, зразумела ж, адтуль) можна адправіць пісьмо, тэлеграму, грашовы перавод, там можна праявіць плёнку, заказаць фатаграфіі, аплаціць паслугі...

Параўнаўча новая сярод іх, як расказала Валянціна Сцяпанаўна, — «Тэрміновая пошта». Яна прадугледжвае прыём і ўручэнне практычна любых адпраўленняў з рук у рукі. Гэта значыць, што па тэлефоне даведачна-інфармацыйнай службы (у Мінску — 154) кліенты (а імі могуць быць і прыватныя асобы, і юрыдычныя) могуць замовіць візіт спецыяліста, які забярэ нейкія дакументы, лекі, рэчы ці іншае і даставіць іх атрымальніку. Пры гэтым ні першаму, ні апошняму не трэба ісці на пошту, афармляць суправаджальныя дакументы і, што здараецца, на жаль, стаяць у чарзе. Да таго ж выйграецца час, бо ўручаецца адпраўленне, як правіла, у той жа дзень ці назаўтра.

Зараз такая паслуга працуе, па-першае, у Мінску, па-другое, паміж ім і абласнымі цэнтрамі. І далей — паміж абласнымі і раённымі.

Што адметна — «не вузее» асартымент паслуг і ў глыбінцы. А тыя аддзяленні сувязі, што размешчаны ў аграгарадках, — працуюць нароўні са сталічнымі...

І, дарэчы, гэтак жа, як і яны, заклапочаны, каб чалавек у бліжэйшыя месяцы не застаўся без сваіх любімых выданняў. На іх, зразумела ж, надзейней падпісацца, для чаго (і даўно ўжо) не абавязкова самому некуды хадзіць. Дастаткова пазваніць... І пошта, у асобе паштальёна, прыйдзе да вас. А яшчэ падпіску можна аформіць з дапамогай пластыкавых картак, праз Інтэрнэт.

Што рабіць, калі на час водпуску мяняецца адрас? Як патлумачылі спецыялісты, можна аформіць пераадрасоўку і, тады, умоўна кажучы, любімую «Звязду» вам будуць прыносіць не ў гарадскую кватэру, а ў вёску, дзе купілі хату альбо здымаеце пакой; можна напісаць заяву на імя начальніка аддзялення сувязі з просьбай пэўны час не дастаўляць газету, а пакідаць яе на пошце. Тады, як кажуць, у поўнай цэласці і захаванасці яна пачакае вашага вяртання.

Трэба ведаць і тое, што многія выданні ў аддзяленнях паштовай сувязі можна купіць. Там жа, маючы час, пагартаць каталогі, пацікавіцца навінкамі, выбраць для сябе нешта новае.

— Сёння ёсць прапановы на любы, нават самы патрабавальны густ, — зазначыла падчас прэс-канферэнцыі начальнік Выдавецкага цэнтра «Марка» Ірына АСТРОЎСКАЯ. — Гэта, зразумела ж, грамадска-палітычныя выданні, эканамічныя, мастацкія, спартыўныя, турыстычныя, дзіцячыя і г.д. Інфармацыю пра іх можна знайсці ў каталогах «Газеты і часопісы Беларусі», «Выданні Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Украіна», «Кнігі»... Так-так, сёлета можна падпісацца (і на пошце, і дома, і па Інтэрнэту, і з дапамогай паштовых тэрміналаў...) на многія навінкі літаратуры — навукова-папулярныя, дэтэктыўныя, на раманы з серыі любоўных... У абсалютнай большасці выпадкаў гэта вельмі даступна па цэнах. Але і іх можна знізіць, калі адмовіцца ад дастаўкі і тое, што выпісаў, забіраць самому на пошце.

Зрэшты, грошы цяпер прынята і модна (!) не толькі лічыць, але і... пазычыць. У банкаў. Многія жыхары краіны сталі іх кліентамі і ўжо прывычна, можна сказаць, звяртаюцца па крэдыты (каля трох тысяч чалавек — гэта новая паслуга пошты — аформілі іх праз аддзяленні сувязі)...

У многіх можа ўзнікнуць пытанне, як падчас водпуску зрабіць чарговы ўнёсак? Для гэтага, як патлумачыла начальнік аддзела плацяжоў РУП «Белпошта» Таццяна ЦІТАВЕЦ, зусім не абавязкова перапыняць адпачынак, і, умоўна кажучы, вяртацца з Нарачы ў Мінск. Дзякуючы укараненню на прадпрыемстве інфармацыйных тэхналогій, плацяжы па крэдытах можна ўносіць практычна ў любым аддзяленні сувязі — як наяўнымі грашыма, так і з дапамогай пластыкавых картак.

Апроч таго, уладальнікі іх у любым гарадскім і «аграгарадоцкім», многіх сельскіх аддзяленнях паштовай сувязі могуць аплаціць любыя паслугі, зняць грошы, папоўніць свае рахункі... Што надзвычай важна, з дапамогай пошты сёння можна, перафразуючы гераіню вядомага фільма, не толькі павучыць чалавека жыць, але і дапамагчы яму матэрыяльна. Гэта значыць, калі падчас адпачынку ў вас раптам скончацца грошы, можна пазваніць, ці напісаць таму, у каго яны ёсць... Калі блізкая душа зразумее вас і адгукнецца, лічыце, што вам пашанцавала: у межах краіны электронны перавод прыйдзе «сёння на сёння», у крайнім выпадку (з улікам выхадных, альбо далёкіх адлегласцяў) — «сёння на заўтра». Адправіць электронны перавод можна і за межы нашай краіны — у Расію, Украіну, Арменію, Малдову, Азербайджан, Казахстан (адтуль, адпаведна, таксама).

Не сакрэт, што кожны кліент на атрыманне паслугі хацеў бы затрачваць як мага менш часу. Для гэтага на «Белпошце» працуе не толькі так званае «адно акно», але і плацежна-касавыя тэрміналы, інфакіёскі, дзе кліент можа сам (па картках альбо наяўнымі) унесці любыя плацяжы, атрымаць інфармацыю па ўмовах крэдытавання ў розных банках, аформіць падпіску. Не выключана, што ў хуткім часе свежыя газеты змогуць прачытаць і падпісчыкі, якія летам з'язджаюць на дачы.

Іншымі словамі, РУП «Белпошта» абяцае сваім кліентам сонечны настрой.

Больш за тое — мае магчымасці яго забяспечыць. Не праміньце скарыстацца.

**Валянціна ДОЎНАР.**

## КАЛІ ЛЕПШ НЕ МЫЦЬ

Некаторыя людзі неахайна адносяцца да ўласнай бяспекі і да захаванасці сваіх рэчаў. Вынікі такіх адносінаў бываюць нярадаснымі. Так, жыхарка дома № 74 па вуліцы Даніла Сердзіча пазбавілася сумачкі, у якой было 400 тысяч рублёў. Як расказала пацярпелая работнікам міліцыі, яна не зачыніла ўваходныя дзверы. У той час як гаспадыня на кухні мыла посуд, хтосьці ціхенька зайшоў у кватэру і знёс сумачку, якая ляжала на тумбачцы ў прыхожай. Затрымаць злодзея не ўдалося.

**Кацярына ГУСЕВА,** *«Мінск-Навіны».*

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА III КВАРТАЛ 2007 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Наследие Чарнобылю
Местное самоуправление
Свая справа
Чырвоная змена
Купі лепшае!
Краіна здароўя

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 8200 рублёў на месяц<br>24600 рублёў на квартал<br>49200 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 7850 рублёў на месяц<br>23550 рублёў на квартал<br>47100 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 13000 рублёў на месяц<br>39000 рублёў на квартал<br>78000 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 11850 рублёў на месяц<br>35550 рублёў на квартал<br>71100 рублёў на паўгоддзе |

## Звязда–90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» застаўся **61** дзень

# «Змагацца і шукаць, знайсці і не здавацца»

**Дарагая газета!**

**У дні твайго 90-гадовага юбілею я хачу павіншаваць цябе і падзяліцца сваімі дасягненнямі і поспехамі за гады пасля публікацыі артыкула пра мяне.**

У 2003 годзе, калі выйшаў артыкул, я заканчвала трэці клас. Зараз я на «выдатна» закончыла ўжо восьмы клас. Я працягваю вучыцца ў гімназіі № 11 у маім класе сярод маіх сяброў, за што вялікі дзякуй адміністрацыі нашай гімназіі, якая змагла арганізаваць навучальны працэс так, што практычна ўсе прадметы я вывучаю на першым паверху будынка школы, акрамя фізікі, хіміі, біялогіі і інфарматыкі, з выкладчыкамі якіх я займаюся па індывідуальнай праграме. Гэта дае мне магчымасць кантактаваць з маімі аднагодкамі і сябрамі і ўдзельнічаць у розных школьных мерапрыемствах. Напрыклад, сёлета я ўдзельнічала ў конкурсе «Вучань года». Праўда, я заняла толькі чацвёртае месца, але спадзяюся ў наступным годзе палепшыць свой вынік. Таксама ў нашай гімназіі праводзяцца розныя конкурсы і алімпіяды па прадметах, канцэрты і дыскатэкі.

У мяне шмат сяброў у школе, як у маім класе, так і ў іншых. Мне прыемна і весела з імі. Мы ўвесь час прыдумваем што-небудзь цікавае і новае. Вось ужо некалькі гадоў існуе афіцыйны сайт нашага класа, дзе мы расказваем шмат забаўляльнай і цікавай інфармацыі пра нас. Таксама ў гэтым годзе мы вырашылі зрабіць фота нашага класа, не звяртаючыся па дапамогу да прафесіяналаў. Паспадзяваўшыся на ўласныя сілы, мы атрымалі выдатны вынік. А яшчэ ў жніўні 2005 года, якраз на мой дзень нараджэння, у мяне з'явіўся яшчэ адзін сябар — адданы і верны сабака па мянушцы Гектар. Праўда, ён маленькі, але ў яго вялікае сэрца і адважны характар. Зараз яму два гады, і калі яго ўзрост пералічыць на чалавечы, то мы аднагодкі, хоць ён лічыць, што я маладзейшая, і спрабуе мяне апякаць.

Мы шмат падарожнічаем з бацькамі. У маі мы ездзілі ў Кракаў (у дадзены момант я пішу кнігу, падзеі якой разгортваюцца ў Вільні і Кракаве ў XVI стагоддзі, таму мне было неабходна ўбачыць на свае вочы месцы, якія я апісваю ў рамане). Нягледзячы на тое, што Каралеўскі замак знаходзіцца на вельмі высокім узгорку Вавеле, і падняцца туды, прама скажам, нялёгка, мы здолелі пераадолець усе цяжкасці, высокія пад'ёмы і крутыя лесвіцы. Мы наведалі ўсе музеі і славутыя мясціны, якія планавалі. Так як я з маімі бацькамі людзі адчайныя і вясёлыя, пераадольванне ўсіх перашкод стараемся ператварыць у яшчэ адну прыгоду. Таму я жадаю ўсім людзям, якія адчуваюць сябе слабымі або не вераць у свае магчымасці, нягледзячы ні на што імкнуцца да сваіх мэтаў і верыць у сябе і людзей, якія знаходзяцца побач! І няхай дэвіз пакаральнікаў Паўночнага полюса «Змагацца і шукаць, знайсці і не здавацца» стане дэвізам вашага жыцця!



Пра Ксенію Шталянкову, дзяўчынку-сонейка, «Звязда» пісала 16 мая 2003 года. На той момант ні грамадскія аб'яднанні, ні Міністэрства адукацыі не маглі прывесці падобнага выпадку: каб дзіця, якое рухаецца на інваліднай калясцы, навучалася ў агульнаадукацыйнай школе, ды яшчэ было там адным з лепшых. Сёння дзяўчынка вітае сваю родную газету на роднай мове.

А табе, дарагая газета, я жадаю далейшага працвітання, цікавых людзей і падзей, шмат-шмат чытачоў і ўсяго самага найлепшага!

**З павагай,**
**Ксенія ШТАЛЯНКОВА.**

# АБЛАСНЫ ШКОЛЬНЫ ВАЛЬС ПРАГУЧАЎ У САЛІГОРСКУ

**Пад развітальны палёт белых галубоў, пад светлым блакітным небам летняга пяшчотнага дня на цэнтральнай плошчы Салігорска сабраліся 364 медалісты з усіх раёнаў сталічнай вобласці на абласны баль выпускнікоў. Упершыню лепшыя вучні Міншчыны сустрэліся разам на агульнае ўручэнне залатых і сярэбных медалёў.**

Колькасць маладых людзей, якія атрымалі атэстат выдатнікаў, павялічылася ў параўнанні з леташнім навучальным годам на 15 працэнтаў. Як адзначыла начальнік упраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама Таіса Данілевіч, усяго 13 тысяч юнакоў і дзяўчат Міншчыны скончылі сёлета сярэднюю школу. «З гэтага года правядзенне абласнога выпускнога балю стане добрай традыцыяй. Я перакананая, што нашы выпускнікі стануць надзейнай апорай для краіны ў будучым. Тым больш што сістэма адукацыі сталічнай вобласці, развіццё якой увогуле не павінна спыняцца, працягвае свой рух наперад з кожным годам», — падзялілася Таіса Данілевіч. У прыватнасці, летась на адукацыйную сферу выдаткавалі 32,5 працэнта ўсяго абласнога бюджэту. А з пачаткам новага навучальнага года, восенню, будуць і далей стварацца ўсе ўмовы для таго, каб кожны малады чалавек мог атрымліваць сучасную, якасную адукацыю. Напрыклад, з трох новых школ краіны, якія плануюць адчыніць свае дзверы ў гэтым годзе, дзве будуць знаходзіцца на Міншчыне — у вёсцы Азярцо Мінскага раёна і ў Сталыгах, што на Мядзельшчыне. «У 64 новых аграгарадках, якія з'явяцца да канца года, будуць адрамантаваны 102 установы адукацыі, — працягвае Таіса Данілевіч. — Да пачатку новага навучальнага года мы павінны зрабіць рамонт у інтэрнатах і сельскіх школах. Матэрыяльная база вясковых школ, калі ўлічваць, што больш за 70 працэнтаў усіх устаноў адукацыі вобласці размешчана ў сельскай мясцовасці, павінна ўдасканальвацца. Мы робім усе для таго, каб забяспечыць роўныя ўмовы навучання гарадскіх і вясковых дзяцей. Таму з пачатку новага навучальнага года будзе паскорана работа і па стварэнню ўстаноў новага тыпу — гімназій і ліцэяў. Значныя сродкі будуць накіраваны на мадэрнізацыю сельскіх дзіцячых садкоў».

На цэнтральнай плошчы Салігорска адбылося і ўручэнне медалёў. Выступаючы перад моладдзю, намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Анатоль Мірчук зрабіў акцэнт на тым, што дзяржава павінна і будзе працягваць падтрымліваць юныя таленты. «Укладанне значных фінансавых сродкаў у адукацыю з'яўляецца для краіны інвестыцыяй у яе будучыню», — паведаміў ён. І такія інвестыцыі абавязкова прынясуць прыбытак. Трэба толькі пачакаць, калі выпускнікі атрымаюць прафесію. Дарэчы, Мінскі аблвыканкам накіраваў 500 мільёнаў рублёў на падтрымку таленавітых школьнікаў.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**






Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

## РОДЫ Ў КВАТЭРЫ

**Незвычайны выпадак адбыўся днямі ў сталіцы. 38-гадовая мінчанка нарадзіла дзіця дома.**

Як паведаміла ўрач аператыўнага аддзела Мінскай гарадской станцыі хуткай дапамогі Наталля Жэкава, выклік аб тым, што ў жыхаркі дома № 32 на вуліцы Данілы Сердзіча пачынаюцца роды, паступіў прыкладна а 14-й гадзіне. Ужо ў 14.15 брыгада хуткай дапамогі была на месцы, але везці парадзіху ў бальніцу ўрачы не адважыліся — дзіця магло нарадзіцца ў машыне. Таму было прынята рашэнне прыняць роды прама ў кватэры. Паводле слоў Наталлі Жэкавай, нованароджаная здаровая і мае нармальную вагу. Дзяўчынку разам з маці даставілі ў 3 клінічную бальніцу.

**Кацярына ГУСЕВА,** *«Мінск-Навіны».*

## Вяртаючыся да надрукаванага

# «Наконт цэменту тэлефануйце ў канцы месяца...»

**Учора наша газета, спасылаючыся на словы міністра архітэктуры і будаўніцтва, паведаміла, што цяпер у магазінах і на рынках цэмент будзе каштаваць аднолькава. Каб нармалізаваць сітуацыю на рынку, устаноўлены адзіныя рознічныя цэны на цэмент па ўсёй краіне, прычым яны з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх суб'ектаў гаспадарання, якія рэалізуюць гэты будаўнічы матэрыял насельніцтву. Так, цэмент падаражэў, але, галоўнае, у забудоўшчыкаў, людзей, якія вядуць рамонтныя работы, з'явілася надзея, што цяпер яго можна будзе знайсці значна прасцей і ў прынцыпе нават па больш нізкіх цэнах, чым яны нядаўна былі ў перакупшчыкаў, што скарысталі момант для павелічэння ўласнага «навару».**

8 чэрвеня мы ўзялі некалькі рэкламных газет і пачалі метадычны абзвон магазінаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прапаноўвалі цэмент. Выбіралі, падкрэслю, або гандлёвыя прадпрыемствы, або фірмы з ліцэнзіяй, ігнаруючы нумары патэнцыяльных перакупшчыкаў. Па легендзе, тэрмінова патрабавалася 6—8 мяхоў цэменту па 50 кілаграмаў, бо ў нас... Што здарылася ў нас, ніхто з прадаўцоў так і не даведаўся, паколькі аўтара гэтых радкоў перапынялі адразу ж пасля першай фразы «ці ёсць у вас цэмент» дружна-катэгарычным «не». Патэлефанаваўшы па тузіну нумароў, мы кінулі гэтую справу, бо сітуацыя была аднолькавая. Толькі ў адным магазіне нам сказалі, што зараз ёсць рэшткі расійскага цэменту па 25 тысяч рублёў за 50 кілаграмаў, але і яны могуць скончыцца ў любы момант. Яшчэ ў адным месцы, спаслаўшыся на адсутнасць цэменту, параілі звярнуцца па мабільнаму нумару да сваіх кліентаў, «якія займаюцца гэтым» (відавочна, перакупшчыкаў). У астатніх дзесяці выпадках проста адказвалі, што патрэбнага нам няма і калі будзе — невядома. Звычайна ветлівыя дзяўчаты-прадаўцы ці дыспетчары на гэты раз літаральна «выціскалі» з сябе па слову. А калі з'явіцца цэмент, колькі чакаць? У адным выпадку на гэта пачуўся раздражнёны адказ, што «мы гэтым больш увогуле займацца не будзем», у другім больш ветліва ўдакладнілі, што калі і з'явіцца цэмент, дык не раней, чым праз месяц. Разгаварыць атрымалася толькі мужчыну-суразмоўцу напрыканцы нашага «расследавання». «Цэменту, я думаю, не будзе ў продажы як мінімум некалькі тыдняў. Вы ж ведаеце, зараз паўсюдна праходзяць праверкі. Навошта рызыкаваць лішні раз? Сітуацыя абавязкова нармалізуецца, цэмент будзе, але давядзецца пачакаць. Колькі можна будзе купіць яго зараз? А вам шмат трэба? Хоць адказаць на гэтае ваша пытанне я пакуль не магу. Магчыма, і будуць нейкія абмежаванні на водпуск у адны рукі, але якія — гаварыць пакуль заўчасна. Але вы абавязкова тэлефануйце нам у канцы месяца...».

**P.S.** Гэтымі нататкамі мы зусім не імкнёмся сцвярджаць, што набыць зараз цэмент цалкам немагчыма. Маючы крыху вольнага часу і ўласны транспарт, можна аб'ехаць шэраг гандлёвых кропак і, думаецца, знайсці патрэбны матэрыял. А калі часу няма, адсутнічае ўласны аўтамабіль? Прыватнікі ж не толькі прададуць табе цэмент, але і могуць пагрузіць-выгрузіць яго, даставіць туды, куды пажадае кліент.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# БРСМ: самаакупляльнасць і канкрэтыка

**8 чэрвеня ў Магілёве завяршыўся семінар рэспубліканскага актыву БРСМ. На працягу трох дзён каля трохсот актывістаў БРСМ, якія прыехалі з усіх рэгіёнаў Беларусі, вывучалі ў Магілёўскай вобласці перадавы вопыт і шукалі інавацыйныя метады ў працы.**

Семінар пачаўся з вучобы ў горадзе Бабруйску, працягнуўся практычнымі заняткамі ў сельскіх раёнах вобласці. 7 чэрвеня ў Магілёўскім драматычным тэатры адбылося ўшанаванне лаўрэатаў прэмій БРСМ.

Трэці дзень семінара пачаўся на мемарыяльным комплексе «Буйніцкае поле». Там актывісты БРСМ правялі мітынг і ўсклалі кветкі да капліцы, ушанавалі хвілінай маўчання памяць абаронцаў Магілёва. Таксама на Буйніцкім полі ўрачыста прынялі ў піянеры і члены БРСМ маладых магіляўчан.

Рэспубліканскі актыў БРСМ завяршыўся ў Магілёўскім выканаўчым камітэце. Там былі падведзены вынікі і намечаны перспектывы ўкаранення інавацыйных тэхналогій у працу маладзёжнай арганізацыі Беларусі.

У пасяджэнні бралі ўдзел кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Генадзь Нявыглас, памочнік Прэзідэнта і начальнік Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Алег Праляскоўскі, старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура. У выступленнях выказаны пажаданні БРСМ па ўдасканаленню працы.

Па-першае, маладзёжнай арганізацыі раілі адысці ад фармалізму, а больш займацца канкрэтнымі справамі на карысць маладых людзей. Напрыклад, апекаваць цяжкіх падлеткаў і праблемныя сем'і — праваахоўчыя органы будуць рады любой дапамозе ў гэтым накірунку. Трэба браць удзел у ажыццяўленні дзяржаўных праграм, у тым ліку актыўна працаваць на адраджэнне сяла.

Перад Саюзам моладзі ставіцца задача за бліжэйшыя два гады адысці ад бюджэтнага фінансавання і перайсці на самаакупнасць. БРСМ, на думку кіраўніцтва краіны, можа займацца развіццём турызму, бізнэсам — напрыклад, ажыццяўляць інвестыцыйныя праекты ў малых гарадах Беларусі, ствараць прадзюсарскія цэнтры, пашыраць рух будаўнічых атрадаў і гэтак далей.

З'явілася ідэя наступны семінар рэспубліканскага актыву адзначыць спартакіядай.

На заканчэнне былі ўзнагароджаны лепшыя тэрытарыяльныя арганізацыі БРСМ па выніках мінулага года. Лепшым абласным камітэтам прызнаны Віцебскі, а лепшым тэрытарыяльным — Магілёўскі гаркам. За розную працу адзначаны наступныя раённыя камітэты: Полацкі, Калінкавіцкі, Камянецкі, Глыбоцкі і Савецкі г. Мінска. За ўкараненне інавацыйных формаў і метадаў працы адзначаны Бялыніцкі райкам БРСМ.

**Ул.інф.**

## Аўтарытэтна

# Працэдура тэсціравання ў Беларусі «падстрахаваная» з усіх бакоў

**«Кампанія па здачы адзінага дзяржаўнага экзамена пачалася са скандала», «Школьнік-махляр пакараны за ЕГЭ», «Выкрадальнікаў сакрэтаў ЕГЭ чакае суд» — такімі загалоўкамі днямі стракаталі старонкі ўсіх расійскіх газет і інфармацыйных агенцтваў.**

Страсці вакол адзінага дзяржаўнага экзамена разгарэліся па той прычыне, што за 10 гадзін да правядзення экзамена па рускай мове, які расійскія школьнікі здавалі 29 мая, адказы на пытанні тэста з'явіліся ў Інтэрнэце. Гэта інфармацыя была хуценька выдалена з Сусветнай павуціны, і чыноўнікі пачалі ліхаманкава вырашаць, што ім далей рабіць. Выказвалася нават прапанова ануляваць вынікі ЕГЭ па рускай мове па ўсёй краіне. Маскоўскія школьнікі размясцілі ў Інтэрнэце адкрыты ліст у адрас прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, міністра адукацыі Андрэя Фурсенкі і генеральнага пракурора Юрыя Чайкі з патрабаваннем адмяніць ЕГЭ па прычыне яго неэфектыўнасці. Яны сцвярджаюць, што адказы на ЕГЭ адкрыта прадаюцца і купляюцца...

У выніку праведзенага расследавання было ўстаноўлена, што шпаргалку ў Інтэрнэце размясціў вучань з Ленінградскай вобласці. Следствам разглядаюцца два варыянты развіцця падзей. Па-першае, магла быць дапушчана ўцечка інфармацыі з Ленінградскага абласнога дэпартамента адукацыі. Але больш верагодна, што ўцечка адбылася ўжо ў пункце правядзення ЕГЭ.

— Хлопчык нейкім чынам атрымаў доступ да запячатанага пакета з экзаменацыйнымі матэрыяламі, — пракаментаваў сітуацыю **кіраўнік Федэральнага агенцтва па нагляду ў сферы адукацыі Віктар БОЛАТАЎ**. — Хутчэй за ўсё гэта адбылося таму, што пакеты вельмі рана прывезлі ў школу. Выпускнік выканаў усе чатыры экзаменацыйныя варыянты (часткі «А» і «В», а частку «С» не выконваў), і размясціў адказы ў Сусветнай павуціне з усімі сваімі памылкамі. Пасля экзамена мы прасачылі, у каго з выпускнікоў маюцца аналагічныя. Такіх набралася па ўсёй Расіі некалькі дзесяткаў чалавек, але ніякіх санкцый мы да іх прымяняць не будзем: яны сябе і так пакаралі, атрымаўшы невысокія балы.

У сераду Віктар Болатаў афіцыйна заявіў, што яны не збіраюцца ануляваць вынікі ЕГЭ па ўсёй Расіі. Як вынікала з яго слоў, аналіз колькасці «двоек», «троек» і «чацвёрак» у Ленінградскай вобласці не адрозніваецца ад сярэдніх паказчыкаў па краіне. Увогуле па Расіі вынікі цяперашняга ЕГЭ па рускай мове супастаўляльныя з мінулагоднімі вынікамі. Вельмі добра здалі дзяржаўны экзамен маскоўскія школьнікі, што сведчыць аб высокай якасці сталічнай адукацыі. А вось віноўніку скандала прыйдзецца пераздаваць ЕГЭ па рускай мове, паколькі яго вынікі былі ануляваныя.

Варта заўважыць, што летась падобная сітуацыя з уцечкай інфармацыі была ў Татарстане, і віноўныя панеслі пакаранне...

На форумах электронных версій расійскіх газет разгарэлася цікавая дыскусія паміж апанентамі і прыхільнікамі ЕГЭ. Першыя сцвярджаюць, што ЕГЭ — гэта спрошчаная форма карупцыі ў сістэме адукацыі. Другія — што ўцечку інфармацыі свядома арганізавалі праціўнікі адзінага дзяржаўнага экзамена, каб дыскрэдытаваць добрую ідэю.

— Я заўсёды вельмі ўважліва сачу за ўсёй інфармацыяй, якая датычыцца правядзення ў Расійскай Федэрацыі ЕГЭ і цэнтралізаванага тэсціравання, — прызнаўся ў гутарцы з журналістам «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**, да якога мы звярнуліся з просьбай пракаментаваць гэту сітуацыю.

Любы скандал у Расіі, звязаны з ЕГЭ, рыкашэтам б'е і па нас, паколькі заваяваць давер абітурыентаў было няпроста. Тым не менш, як мне здаецца, нам гэта ўдалося. Увогуле пераважная большасць меркаванняў апанентаў ЕГЭ зводзяцца да крытыкі дрэннай яго арганізацыі, якая не забяспечвае захаванне канфідэнцыяльнасці інфармацыі экзамена. Быццам бы ЕГЭ не толькі не вырашае праблему карупцыі, а стварае для яе глебу. Разважаюць аб тым, што класы, у якіх праходзіць ЕГЭ, падзяляюць на «платныя» і «бясплатныя». Для тых, хто за экзамен заплаціў, настаўнікі ў суседнім памяшканні рашаюць тэсты і прыносяць выпускнікам правільныя адказы. Сапраўды, у Расіі ёсць шмат спецыфічных момантаў. Узяць хоць бы яе адлегласці. Былы дырэктар расійскага Федэральнага цэнтра тэсціравання Уладзімір Хлебнікаў, калі прыязджаў у Мінск на міжнародную навуковую канферэнцыю, прызнаваўся, што ў многіх краінах для забеспячэння захаванасці інфармацыі прыцягваюцца сілы нацыянальнай бяспекі. У Беларусі, дарэчы, дастаўкай тэставых матэрыялаў у пункты правядзення ЦТ і назад, у наш інстытут, займаецца дзяржаўная фельд'егерская служба. Расіянам для гэтых мэтаў спатрэбілася б 10 дывізій ФСБ, што абсалютна нерэальна. Да таго ж у Расіі немагчыма даставіць матэрыялы ЕГЭ непасрэдна перад пачаткам экзамена — гэта не наша тэрыторыя.

Наша тэхналогія правядзення цэнтралізаванага тэсціравання крыху адрозніваецца ад ЕГЭ, і пакуль што ў Беларусі не было даказана ніводнага выпадку ўцечкі інфармацыі. Хоць спробы «падмачыць» рэпутацыю цэнтралізаванага тэсціравання ўсё ж такі рабіліся. Некалькі гадоў таму побач з вучэбнымі карпусамі, дзе праводзілася цэнтралізаванае тэсціраванне, махляры наладзілі гандаль «адказамі» на тэставыя заданні. Зразумела, што іх тавар быў звычайнай «ліпай» і ніводная з канфіскаваных работнікамі МУС «шпаргалак» не супадала з сапраўднымі адказамі на тэсты. Затым прымаліся спробы прадаваць «адказы» на тэставыя заданні праз Інтэрнэт. Не перастаю здзіўляцца наіўнасці людзей, якія становяцца ахвярамі прымітыўнага «лахатрона». Летась на сайце beltest.net абітурыентам нават абяцалі скідкі пры афармленні заказа на адказы па двух і больш вучэбных дысцыплінах цэнтралізаванага тэсціравання.

**Афіцыйна заяўляю, што аб тым, якія заданні трапяць у канчатковыя варыянты тэстаў, не ведае сёння ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў ні адзін чалавек, у тым ліку і яго дырэктар**. Наш банк тэставых заданняў змяшчаецца ў ноўтбуку, які захоўваецца ў сейфе і недаступны для хакерскіх атак. Доступ да ноўтбука мае адзін чалавек, і ён сам сабе не вораг. З сейфа ноўтбук дастаецца толькі непасрэдна напярэдадні правядзення тэсціравання. Запушчаная камп'ютарная праграма метадам сляпога выбару фарміруе 10 варыянтаў для цэнтралізаванага тэсціравання. Кампаноўка і адбор будучых варыянтаў адбываюцца ў прысутнасці членаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, такім чынам рызыка ўцечкі інфармацыі на папярэдніх этапах абсалютна выключаецца. Увогуле мы вельмі ўдзячныя пільнай увазе да цэнтралізаванага тэсціравання з боку дзяржаўных кантралюючых органаў, якая істотна павышае давер да цэнтралізаванага тэсціравання і выключае магчымасць злоўжыванняў.

Для дастаўкі тэстаў ва ўсе аўдыторыі, дзе праходзіць тэсціраванне, рыхтуюцца спецыяльныя пластыкавыя пакеты. У адрозненне ад папяровых, іх непрыкметна ўскрыць немагчыма. На кожным з пакетаў ставіцца штамп, пячатка і подпісы членаў камісіі па правядзенню тэсціравання. У такія ж пакеты мы кладзем і чыстыя бланкі адказаў. Усе яны маюць ступень аховы амаль як на грашовых знаках і з'яўляюцца дакументамі строгай справаздачнасці, таму поўнасцю выключаецца магчымасць іх замены ці фальсіфікацыі. Паколькі маладыя людзі, якія бяруць удзел у тэсціраванні, могуць дапусціць памылку пры ўнясенні сваіх пашпартных даных у бланк адказаў, на кожную аўдыторыю выдзяляецца дадаткова яшчэ да 10 працэнтаў ад агульнай колькасці бланкаў. Пасля запаўнення вобласці рэгістрацыі незапатрабаваныя і сапсаваныя бланкі зноў запячатваюцца, і толькі пасля гэтага ў аўдыторыі, нарэшце, ускрываецца пакет з варыянтамі тэставых заданняў. Такім чынам пасля пачатку тэсціравання падмяніць бланк ужо немагчыма.

Удзельнікі тэсціравання рассаджваюцца ў аўдыторыі згодна з жараб'ёўкай. Члены арганізацыйнай камісіі, якія прысутнічаюць у аўдыторыях і назіраюць за працэсам цэнтралізаванага тэсціравання, таксама не ведаюць, у якой аўдыторыі ім давядзецца працаваць — для гэтага існуе жараб'ёўка. Да таго ж на тэсціраванні, скажам, па матэматыцы, у аўдыторыі не могуць прысутнічаць выкладчыкі матэматыкі ці фізікі, а на тэсціраванні па дзяржаўнай мове — філолагі, што таксама з'яўляецца дадатковай страхоўкай.

**Магчыма, удзельнікі цэнтралізаванага тэсціравання не ведаюць, што адказы на тэставыя заданні ў навучальныя ўстановы не перадаюцца. Яны знаходзяцца ў нашым сейфе да таго моманту, пакуль усе бланкі адказаў не будуць дастаўленыя фельд'егерскай службай у наш інстытут і не будуць сканіраваныя апаратарамі на камп'ютар.** Апаратары ўмяшацца ў працэс праверкі тэставых работ таксама не могуць. Задача апаратара — прасачыць за правільнасцю распазнавання сімвалаў на бланках. Скажам, камп'ютар можа прыняць лічбу «3» за «8», калі яна напісана неакуратна. Апаратар папярэджвае магчымую памылку камп'ютара. Свае знакі ён унесці ў бланк не можа, бо праграмнае забеспячэнне запамінае любое зробленае ім выпраўленне. Да таго ж адзін апаратар працуе з вобласцю рэгістрацыі, а другі — непасрэдна з адказамі, і ён не можа ведаць, чый бланк знаходзіцца перад ім. Акрамя відэакамер, за апаратарамі вядзецца яшчэ і візуальны нагляд адным з нашых работнікаў, які пастаянна прысутнічае ў пакоі. Відэакамера фіксуе ўсё, што адбываецца ў пакоі, і ўсіх, хто ў яго заходзіць. Мы захоўваем відэазапісы і можам пры неабходнасці ў любы момант іх прагледзець.

Спадзяюся, што мне ўдалося пераканаць абітурыентаў у тым, што ім лепш спадзявацца толькі на свае веды. А за парушэнні правілаў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання (выкарыстанне самаробных шпаргалак, запісаў, электронных запісных кніжак, прыстасаванняў для прыёму і перадачы інфармацыі, мабільных тэлефонаў) удзельнік тэсціравання выдаляецца з аўдыторыі і пазбаўляецца права ўдзельнічаць у экзамене. І пераздаць яго ў рэзервовы дзень яму таксама не дазволяць. Летась за розныя парушэнні былі адхілены ад удзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні 66 чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Краіна здароўя
Выпуск № 12 (25)

Доктар адказа

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**На наступным тыдні дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222-70-80) будуць:**

*11 чэрвеня* — галоўны ўрач 16-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена Іванаўна КУЛЬБЕДА.

*12 чэрвеня* — галоўны ўрач 3-й сталічнай дзіцячай клінічнай бальніцы Людміла Пятроўна КАЗАЧКОВА.

*13 чэрвеня* — галоўны ўрач 20-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына Юр'еўна ЗАМЕЛІНА.

*14 чэрвеня* — галоўны ўрач 4-й сталічнай дзіцячай клінічнай бальніцы Галіна Уладзіміраўна ДУДАРАВА.

*15 чэрвеня* — галоўны ўрач 15-й сталічнай паліклінікі Віялета Брасілаўна ШУРЫГІНА.

У графіку магчымыя змяненні.

# Каб лета было ў радасць

## *Мсціслаўская лекарка-траўніца Ганна Куляшова дае парады чытачам «Звязды» на лета*

**Лета — час адпачынку і адпускоў. Наш арганізм настойліва патрабуе расслаблення. І хоць многія адпраўляюцца не да марскога берага, а на дачныя сотачкі, у любым выпадку — гэта кантакт з прыродай. Ганна Куляшова раіць летам браць ад вады, сонца, зямлі і паветра ўсё карыснае. Каб лета было ў вылячэнне і радасць.**

### Ваду пакіньце пад зоркамі

Агульнавядома, што ўзімку арганізм чалавека адчувае недахоп вітаміну Д, і таму лета мы сустракаем бледнаскурыя, у дакладным сэнсе гэтага слова. Лекарка раіць адкрывацца сонейку разумна.

— Добра для энергетыкі чалавека сустрэць **світанне**, і каб пры гэтым цела было максімальна адкрытым, — гаворыць Ганна. — Вы прывітаеце сонца, і яго першыя промні не абпаляць скуру. Затое атрымаеце бадзёры тонус. Трэба на золку басанож пахадзіць па траве і нават па зямлі, а таксама памыцца.

Куляшова раіць увечары пакінуць ваду на ноч на двары — каб пабыла пад зоркамі і набралася энергіі спакою і цішыні. Лекарка вучыць: калі месяц расце — вада дасць нам аздараўленне і прыгажосць, калі паменшаецца — хваробы сыдуць, такое народнае павер'е.

— **Вада** — гэта жывая разумная субстанцыя, — сцвярджае Ганна. — Каб яна дапамагла, можна над ёй прачытаць малітву, каб дыханне краналася паверхні вады. Альбо проста пажадаць вадзе дабра, а яна сама выдатна ведае, як вам дапамагчы. А ўвогуле сустрэча світання — гэта нібыта рытуал прывітання святла, і ў адказ мы напаўняемся добрай энергіяй.

### Крапіва — дадаваць у стравы і лячыць валасы

Улетку ёсць багацце раслін, якія дапамагаюць чалавеку аздаравіцца. Куляшова вучыць, што за гэты час трэба атрымаць набор вітамінаў і падсілкавацца энергіяй — так, каб арганізму хапіла да наступнага лета.

— Напрыклад, **крапіва**, — пачынае па спісе траўніца. — Цяпер ужо яе навалам усюды. Гэтую вітамінную расліну трэба дадаваць у любыя салаты — няшмат, і папярэдне абдаць кіпенем, каб не абстрыкацца. Крапіва прыдатная таксама і для халодных супоў. А, дарэчы, можна яшчэ дадаць у бацвінне і **лебяду**. Вы думаеце, што сяляне ў мінулыя стагоддзі былі такія бедныя, што елі крапіву ды лебяду? Не, яны былі мудрыя. І нам сёння нядрэнна з іх узяць прыклад у харчаванні.

Крапівой Ганна раіць лячыць і валасы, якія за зіму сталі бляклыя, а цяпер яшчэ і сонцам абпальваюцца без літасці. У гэтай справе самае галоўнае — не ленавацца. Узяць пучок крапівы на вядро вады, нагрэць — не да кіпеня, і даць настаяцца. За гэты час нядрэнна было б, гаворыць лекарка, памыць галаву экалагічна чыстым, прыродным шампунем: яйкам з чорным хлебам, альбо проста жаўтком. А ўжо потым абдаць галаву адварам крапівы. Куляшова гарантуе: валасы будуць бліскучыя і здаровыя.

### Стомленыя ногі абгарніце лопухам

За зіму таксама моцна стамляюцца ногі.

— Па-першае, трэба не баяцца хадзіць басанож, і не толькі па траве, але і па зямлі, — пераконвае Ганна. — Нават прыхільніцам ідэальнага педыкюру патрэбен масаж ступняў, а таксама падзарадка энергетыкай зямлі. Гэта будзе ваш падарунак стомленым нагам! Гавораць, што такім чынам з нас сыходзіць, так бы мовіць, дрэнная электрычнасць. І гэта праўда: аддаём дрэннае, атрымліваем добрае. Быць бліжэй да зямлі — гэта добрая парада. Волаты ў старажытнасці спалі на зямлі і казалі: «Маці, сырая зямліца, дапамажы!» І, відаць, мелі рацыю.

Прыродныя лекары для стомленых ног растуць зусім побач, сцвярджае траўніца. Увечары навярэджаныя ногі можна абгарнуць вялікім **лістом лопуху,** яго аксаміцістым бокам. Гэты ліст выцягне з нагі ацёкі, лішнюю вадкасць і тлушч.

— А калі чалавек пакутуе ад солі ў нагах, а такіх шмат, то трэба скарыстаць лісце хрэну, — расказвае Куляшова. — Праўда, калі скура пяшчотная, то трэба правесці тэст, ці не пачырванее яна ад хрэну. Ліст прыкладайце тым бокам, які бліжэй да сонца. Можна трымаць яго на назе да 2-х гадзін. Пасля гэтага ліст будзе нібыта ў белых крапінах — гэта і ёсць тая «соль», якую расліна выцягнула.

Для ног лекарка раіць выкарыстоўваць таксама **бярозу**. Некалькі галінак запарыць у вадзе, як венік у лазні. І потым зрабіць ванну для ног — тэмпература вады павінна быць прыемная. Такая працэдура не дасць развівацца грыбку, залечыць раны — у бярозе ёсць дубільныя рэчывы і смолы, а пах надасць лепей любога дэзадаранту ці касметычнага талька.

### Часнаком — па стомленасці

Летні водпуск — самая чаканая пара, але часам падаецца, што дажыць да яе вельмі складана. Як перамагчы стомленасць і дастойна дацягнуць да адпачынку? Мсціслаўская траўніца рэкамендуе выкарыстоўваць **малады часнок**, які ўжо ёсць на агародах.

— Трэба ўзяць 5 галовак маладога часнаку, здрабніць іх і заліць паўлітра гарэлкі, — Ганна расказвае рэцэпт. — Гэта павінна настояцца тыдзень, і потым прымаць па 1/2 чайнай лыжкі тройчы на дзень. Гэта вадкасць прыбярэ таксіны, якія назапасіліся ў арганізме, а яны і ёсць віноўнікі стомленасці чалавека.

Праўда, такі рэцэпт зусім не пасуе людзям, якія ездзяць за рулём аўтамабіля. Для іх і ўвогуле прыхільнікаў цвярозасці лекарка раіць змагацца са стомленасцю **чорнымі парэчкамі** (перацерці з цукрам і рабіць морсы — гэта крыніца вітамінаў і антыаксідантаў) і **салодкім перцам**, які з'яўляецца рэкардсменам па вітаміну С. Менавіта перац спальвае халестэрын і лечыць сасуды, а таксама ўмацоўвае валасы і пазногці, паляпшае скуру. Куляшова раіць ужываць па магчымасці не кансерваваны перац, а свежы.

І трэба адпраўляцца ў лес па **суніцы**. Гэта смачная ягада падорыць задавальненне, шмат вітамінаў, а таксама дапаможа пазбавіцца стомленасці. Акрамя гэтага, суніцы дапамагаюць працы сэрца.

### Лепшы ліфтынг — клубнічны

У мінулым артыкуле з парадамі Ганна рэкамендавала для пахудзення бурак. Цяпер маладых буракоў яшчэ няма, таму трэба дадаваць **бураковае бацвінне** ў салаты — няшмат, 2-3 лісцікі. Яно, паводле лекаркі, прыбірае лішні тлушч, дапамагае сасудам, кішэчніку і сэрцу.

Тым, хто жадае скінуць вагу, трэба таксама есці дыні.

***(Заканчэнне на 7-й стар.)***

# КОЛЬКАСЦЬ АХВЯРАЎ КЛЯШЧОЎ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ Ў 8 РАЗОЎ!

Як паведаміла журналісту «Звязды» энтамолаг аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана Яшкова, за перыяд з сакавіка па май ад укусаў кляшчоў у Беларусі пацярпелі ўжо 3969 чалавек. Увогуле сёлета па прычыне ранняй і цёплай вясны кляшчы паводзяць сябе надзвычай актыўна. Акрамя таго, як сведчаць назіранні энтамолагаў, іх колькасць значна павялічылася ў дзікай прыродзе. На тэрыторыі Віцебскай вобласці — амаль у 4,7 раза. У параўнанні з аналагічным перыядам 2006 года колькасць беларусаў, якія пацярпелі ад укусаў кляшчоў, павялічылася ў 8 разоў! У найбольшай ступені ад нападу кляшчоў пацярпелі жыхары Брэсцкай, Мінскай абласцей і сталіцы — 648, 595 і 1073 выпадкаў адпаведна. А на Гродзеншчыне ў мае была зарэгістравана ўспышка клешчавога энцэфаліту. Там пасля спажывання сырога малака казы 6 чалавек трапілі на бальнічныя ложкі.

На тэрыторыі Мінска і прыгарадных зон адпаведна выяўлена ўжо 15 ачагоў «пражывання» іксодавых кляшчоў. Кляшчы «аблюбавалі» лясныя масівы Сляпянкі, Сцяпянкі, пасёлка Сосны, мікрараёна «Уручча-4», вуліц Нікіфарава, Старыначускай, Бехцерава, Цікоцкага, Сцебянёва, лесагадавальнік у раёне вуліцы Панамарэнкі, Батанічны сад, а таксама лясныя масівы, размешчаныя побач з вадасховішчамі Крыніца, Дразды, Цнянскае і Заслаўскае. У Мінску, дарэчы, у гэтым годзе зарэгістравана ўжо 39 выпадкаў захворвання мінчан на Лайм-барэліёз. Летась захварэлых было 240 чалавек.

— Лайм-барэліёз — гэта вострае бактэрыяльнае захворванне, якое можа перайсці ў хранічную форму, — тлумачыць Святлана Яшкова. — У выніку хваробы Лайма церпяць нервовая і сардэчна-сасудзістая сістэмы, апорна-рухальны апарат, адбываецца агульная інтаксікацыя арганізма чалавека. Калі на месцы, дзе прысмактаўся клешч, праз 1—2 тыдні (зрэдку праз месяц) з'яўляецца выразная чырвоная пляма (у сярэдзіне больш светлая), якая павялічваецца ў памерах, а затым падобныя кольцы з'яўляюцца і ў іншых месцах, гэта першыя сімптомы хваробы Лайма. Хворыя скардзяцца на ўмераны галаўны боль, агульную слабасць, недамаганне. Тэмпература цела можа павышацца да 38 градусаў. У гэты перыяд захворванне паддаецца лячэнню антыбіётыкамі. Але калі яго не лячыць, то яно набывае хранічны характар, і ў позніх стадыях развіваюцца цяжкія паражэнні органаў і сістэм: артрыты, трывалыя атрафічныя змяненні скуры, паражэнні нервовай сістэмы і галаўнога мозга.

Кляшча, які паспеў прысмактацца, трэба пастарацца выдаліць цалкам, месца ўкусу апрацаваць любым спіртавым растворам. Пры вяртанні з лесу неабходна звярнуцца да ўчастковага тэрапеўта ці інфекцыяніста, які пры неабходнасці прызначыць прафілактычнае лячэнне і адправіць кляшча ў лабараторыю для даследавання. Малако коз можна спажываць толькі пасля кіпячэння: вірус клешчавога энцэфаліту гіне за 2 хвіліны кіпячэння.

На шчасце, не ўсе кляшчы інфіцыраваны ўзбуджальнікамі Лайм-барэліёзу і клешчавога энцэфаліту. Клешчавым энцэфалітам інфіцыраваны ад 7 да 11 працэнтаў кляшчоў, а барэліямі, якія выклікаюць хваробу Лайма, — ад 15 да 33 працэнтаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## НА ШТО ТРАЦЯЦЦА КАЛОРЫІ?

**Метабалізм — гэта працэс у клетках, які ператварае ежу ў энергію. Энергія ж нам патрэбна заўсёды, нават калі мы спім.**

На падтрымку асноўных жыццёвых функцый траціцца львіная доля ўсіх расходных калорый — 60-75 працэнтаў. Гэты паказчык называюць абменам рэчываў у стане спакою, і залежыць ён ад многіх фактараў: канстытуцыі, вагі, спадчыннасці, узросту, гарманальнага фону, мышачнай масы. Менавіта таму адны ядуць усё без разбору і пры гэтым не таўсцеюць, а другія, каб не раздавацца ў таліі, вымушаны ва ўсім сябе абмяжоўваць. На забеспячэнне фізічнай актыўнасці затрачваецца прыкладна 15—30 працэнтаў і менавіта гэтай часткай мы ў стане кіраваць. Астатнія 10 працэнтаў ідуць на пераварэнне ежы.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



Каля фантана ў Салігорску

# ТРЫМАЙЦЕ ЦАЦКІ Ў МАРАЗІЛЬНІКУ,

## або Як засцерагчыся ад бытавых алергенаў

Сёння кожны пяты жыхар Зямлі пакутуе на розныя алергічныя праявы, вядома больш за 20 тысяч алергенаў. Алергія — гэта не толькі цяжкія захворванні, напрыклад, бранхіяльная астма, але і рыніт, крапіўніца, іншыя хваробы.

Вельмі шмат алергенаў знаходзіцца ў памяшканнях, дзе мы жывём. Як вынік — бытавыя алергены ўздзейнічаюць на чалавека круглы год.

Характэрнымі праявамі бытавой алергіі з'яўляюцца чханне, сверб носа і павек, насмарк, слёзацячэнне. Могуць з'яўляцца прыступы ўдушша, кашаль. У некаторых пры кантакце з пылам рэагуе і скура — свербам, пачырваненнем, крапіўнымі высыпкамі. Усе гэтыя сімптомы ўзнікаюць дома, больш выражаныя раніцай і ноччу, а таксама пры ўборцы, рамонце кватэры, кантакце са старымі рэчамі.

Людзям, схільным да алергічных рэакцый рознага паходжання, трэба прытрымлівацца пэўных правілаў у паўсядзённым жыцці. Вось якія рэкамендацыі па стварэнню гіпаалергеннага быту дае **кандыдат медыцынскіх навук, урач-алерголаг, дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла Маслава.**

■ Максімальна разгрузіце жылое памяшканне ад лішніх рэчаў, якія назапашваюць пыл: дываноў, парцьераў, мяккай мэблі і г.д.

■ Выкарыстоўвайце для матрацаў, коўдраў і падушак спецыяльныя супрацьалергічныя ахоўныя чахлы. Сінтэтычныя падушкі, матрацы і коўдры не забяспечваюць дастатковай абароны ад кантакту з кляшчамі. Яны выключаюць уздзеянне эпідэрмальных алергенаў: пяра, поўсці, з якіх выраблены. Кляшчы ж могуць жыць і ў сінтэтычных пасцельных рэчах. Сінтэтычную пасцельную бялізну мыйце штодзённа пры тэмпературы 60° С.

■ Па магчымасці адмоўцеся ад дываноў у доме. Калі гэта немагчыма, апрацоўвайце дываны сродкамі, якія знішчаюць кляшчоў (акарыцыды): бензіл, бензаат, піратоіды, метылпірымфос).

■ Кляшчы празрыстыя і не маюць абароны ад сонечнага святла. Таму па магчымасці выносьце на сонца падушкі, коўдры і матрацы не менш чым на 3 гадзіны.

■ Зніміце цяжкія фіранкі, шторы. Фіранкі павінны быць бавоўнянымі або з ільну, мыйце іх часта ў гарачай вадзе. Але лепш выкарыстоўвайце жалюзі.

■ Пажадана, каб у кватэры была мэбля, якую можна выцiраць. Мэблю, абабітую тканінай, пыласосьце не менш як 2 разы ў тыдзень, у тым ліку ручкі, спінкі і падлакотнікі. А ўвогуле лепш, каб мэбля была абабітая скурай або замяняльнікамі.

■ Выкарыстоўвайце пыласос з фільтрам для найдрабнейшых часцінак. Лепш выкарыстоўваць мыючы пыласос. Алергікам не варта самім выграцаць пыл з пыласоса і рэчаў.

■ Пазбягайце пераўвільгатнення паветра, выкарыстоўвайце кандыцыянер. Кляшчы лепш за ўсё размнажаюцца пры адноснай вільготнасці 75—80 працэнтаў і не могуць жыць пры вільготнасці 50 працэнтаў.

■ Сачыце за тым, каб у доме не было адсырэлых плямаў на столі і сценах. Назапашванне вільгаці садзейнічае росту плесневых грыбоў. Таму варта замяніць дываны шчыльным пакрыццём, шпалеры — фарбай. Плесневыя грыбы могуць размнажацца і ў кветкавых гаршчках. У сувязі з гэтым вельмі важна правільна даглядаць хатнія расліны. Па-за домам пазбягайце касьбы травы летам — у гэты час на раслінах шмат спор плесні.

■ Абарона ад алергенаў жывёльнага паходжання таксама патрабуе пэўных мераў. Не трымайце ў доме жывёл і птушак. Памятайце — не бывае неалергенных жывёл і іх алергеннасць не залежыць ад даўжыні поўсці. Зразумела, цяжка пазбавіцца ад хатняга любімца, але тут выбар стаіць паміж ім і вашым здароўем. Калі ж не хочаце развітвацца з катом, то яго варта мыць кожны тыдзень, што дазволіць знізіць алергеннасць. Старанныя і частыя ўборкі абароняць вас ад паўторных прыступаў, выкліканых жывёльнымі алергенамі, якія засталіся ў пыле, абіўцы мэблі, фіранках, дыванах. Аднак вяртанне хваробы можа выклікаць кантакт з мехам жывёлы (футра, каўнер, шапка), вырабамі з поўсці (мохер, ангора, казіная поўсць) і некаторымі лекавымі прэпаратамі (лячэбныя сыроваткі).

Варта сказаць і пра мяккія цацкі з поўсці. Дзеці не павінны браць іх у ложак. Цацкі трэба пыласосіць, падвяргаць хімічнай апрацоўцы, мыць у гарачай (60° С) вадзе або класці на ноч у маразільнік (- 20° С), каб зменшыць колькасць кляшчоў.

**Вольга ШАЎКО.**

# АСТЭАПАРОЗ

## Актуальна для жанчын, і не толькі

Мужчыны, называючы сваіх каханых «крохкімі» стварэннямі, наўрад ці ўсведамляюць, што так яно і ёсць: нават мажная красуня можа аказацца больш крохкай, чым статуэтка з японскага фарфору. Справа ў тым, што жанчыны больш, чым мужчыны, схільныя да астэапарозу. Астэапароз — захворванне шкілета, якое характарызуецца зніжэннем агульнай касцявой масы, у сувязі з чым косці становяцца крохкімі і ломяцца нават пры невялікіх нагрузках. У літаральным перакладзе з грэчаскай мовы слова «астэапароз» азначае «порыстыя косці». Косць — гэта жывая тканка, якая складаецца ў асноўным з кальцыю. Калі мы маладыя, касцявая тканка, як і іншыя, пастаянна абнаўляецца — старыя клеткі зношваюцца і адміраюць, а іх месца займаюць новыя і здаровыя. Аднак па меры таго, як мы старэем, клеткі зношваюцца хутчэй, чым арганізм паспявае іх замяніць, таму косці пачынаюць страчваць шчыльнасць (касцявую масу), часцей падвяргаюцца пашкоджанням (утварэнню трэшчын або пераломаў) і даўжэй зрастаюцца.

На жаль, паколькі косці схаваныя пад слоем мышцаў, тлушчавай праслойкі і скуры, а патанчэнне касцявой тканкі працякае бессімптомна, большасць хворых на астэапароз нават не падазраюць аб сваім стане да таго часу, пакуль у выніку нязначнага падзення не зломяць косць бядра або запясця. Нават просты кашаль або чханне могуць выклікаць утварэнне трэшчыны ў рабры. Да найбольш распаўсюджаных сімптомаў гэтай хваробы адносяцца змяншэнне росту (хворыя «стоптваюцца» аж на 10—15 см), скрыўленне пазваночніка, болі ў спіне, сутаргі ў нагах, ломкасць і слаенне пазногцяў. Адно з самых цяжкіх наступстваў гэтай немачы — перадом шыйкі бядра, балючыя аперацыі і невялікія шанцы зноў устаць на ногі, як раней. Акрамя таго, пры запушчаным астэапарозе пазваночнік ужо не можа несці звычайную нагрузку, спіна згінаецца, і чалавеку становіцца складана не толькі стаяць, але нават сядзець без апоры.

Найбольш схільныя да астэапарозу жанчыны постклімактэрычнага ўзросту (на гэту групу прыпадае 1/3 усіх выпадкаў захворвання). Тлумачыцца гэта тым, што яечнікі спыняюць выпрацоўку жаночага гармону эстрагену. Апошні ж дапамагае ўтрымліваць кальцый і іншыя мінералы ў касцявой тканцы, што забяспечвае трываласць і здароўе касцей, таму рэзкае зніжэнне ўзроўню эстрагену пасля клімаксу прыводзіць да страты шчыльнасці касцявой тканкі. Існуе і старэчы астэапароз, аднак ён сустракаецца з аднолькавай частатой як у жанчын, так і мужчын пасля 60 гадоў. Тут вінаваты не гармоны, а пагаршэнне ўсмоктвання кальцыю ў кішэчніку і дэфіцыт карысных для касцей вітамінаў. Развіццю хваробы ў больш раннім узросце або ў больш цяжкай форме садзейнічаюць таксама маларухомы лад жыцця, курэнне, алкагалізм, працяглы прыём некаторых медыкаментаў (стэроідныя гармоны, тэтрацыкліны і інш.).

Лічыцца, што астэапароз — захворванне, якое лепш папярэдзіць, чым лячыць.

Прафілактыка астэапарозу — гэта перш за ўсё збалансаванае харчаванне, рухальная актыўнасць, забеспячэнне арганізму дастатковай колькасцю кальцыю і вітаміну D.

Больш за ўсё кальцыю змяшчаецца ў малочных прадуктах (сыр, тварог, ёгурт), зяленіве, шпінаце, капусце, салаце, моркве, рыбных касцях, інжыры і абрыкосах, арэхах, семках, соі і іншых бабовых. Пажадана скараціць ужыванне жывёльнага бялку, солі і кавы, бо яны пагаршаюць усмоктванне кальцыю і яго захоўванне ў касцях. Частае піццё газаваных напіткаў — адзін з фактараў рызыкі развіцця хваробы. Гэта звязана з тым, што ў іх змяшчаецца фосфар, які садзейнічае вымыванню кальцыю з касцей і зубоў.

Для найлепшага засваення кальцыю неабходны вітамін D. Частку апошняга мы атрымліваем з ежай (сметанковае масла, рыбін тлушч, яечны жаўток, рыбныя кансервы), але найбольш эфектыўна ён утвараецца ў арганізме чалавека пад уздзеяннем ультрафіялету. Для атрымання неабходнай на ўвесь год колькасці вітаміну D дастаткова знаходзіцца на сонцы ў летнія месяцы на працягу 15—20 хвілін штодзень.

***Штодзённая патрэбнасць кальцыю складае:***

*Цяжарныя і кормячыя — 1200 мг*

*Маладыя людзі да 25 гадоў — 1200 мг*

*Мужчыны старэй за 50 гадоў — 800 мг*

*Жанчыны ў перыяд да менапаўзы — 1000 мг*

*Жанчыны ў перыяд пасля менапаўзы — 1500 мг*

Косцеўтварэнне таксама стымулююць фізічныя практыкаванні, асабліва аэробіка, бег, тэніс і нават хуткая хадзьба. Так, 50 скачкоў на месцы штодзень павялічваюць шчыльнасць косці. Хворым жа на астэапароз прызначаюць масаж і лячэбную фізкультуру ў невялікіх дазіроўках — па прычыне крохкасці касцявой тканкі. Ім нельга падымаць прадметы цяжэй за 5 кілаграмаў. Пры неабходнасці ўрачы раяць насіць падтрымліваючыя гарсэты.

Сёння ў аптэках прапануецца вялікі асартымент прэпаратаў, якія змяшчаюць кальцый і вітамін D. Аднак неабходна памятаць, што іх бескантрольны прыём прыводзіць да сумных наступстваў. Працяглая перадазіроўка выклікае адкладанне кальцыю ў розных органах і, як вынік, — развіваецца мочакаменная хвароба, нырачная недастатковасць, пагаршэнне зроку. Прэпараты кальцыю трэба прымаць падчас або пасля яды. Калі прыняць кальцый на галодны страўнік, можа адбыцца расстройства апошняга. Прэпараты кальцыю лепш засвойваюцца, калі запіваць іх кіслым сокам (напрыклад, апельсінавым).

Да нядаўняга часу лічылася, што астэапароз — праблема, якая ўзнікае ў старасці, і маладым апасацца няма чаго. Сучасныя ж даследаванні паказалі, што першыя званочкі гэтай хваробы могуць прагучаць яшчэ... да нашага нараджэння. Аказваецца, калі маці падчас цяжарнасці недаатрымлівала кальцыю і вітаміну D, дзіця (асабліва дзяўчынка) нараджаецца ўжо з дэфіцытам касцявой масы каля 10 працэнтаў. Таму бацькі павінны сачыць, каб харчаванне іх дзяцей было багатае на кальцый. І яшчэ. Калі астэапароз — ваша «сямейнае» захворванне, удзяляйце больш увагі здароўю сваіх дачок! Нізкая вага, позні пачатак менструацыі павышаюць рызыку захворвання.

Траўмы і пераломы часта адбываюцца дома. Таму лепш прыняць меры перасцярогі: вострыя вуглы мэблі, парогі, слізкія месцы і перашкоды на падлозе могуць стаць прычынай падзення.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## Водогрязелечебница Республиканского центра медицинской реабилитации и бальнеолечения

***Предлагает эффективное лечение заболеваний:***

- суставов и позвоночника
- нервной и сердечно-сосудистой системы
- органов дыхания и пищеварения
- гинекологических и урологических заболеваний.

Минеральные, радоновые, скипидарные, «сухие» углекислые ванны, лечебные души, бассейн с минеральной водой, грязелечение, все виды массажа, традиционная китайская медицина, лечебная физкультура и многое другое.

*Лечение по путевкам и в виде отдельных процедур с 8.00 до 21.00.*

**Стоимость путевки на 18 дней — 217 200 рублей.**

По государственным ценам оказываем широкий спектр консультативно-диагностических услуг (УЗИ всех органов, эндоскопические, функциональные, лабораторные исследования, консультации специалистов).

*г. Минск, ул. Макаенка, 17.*

***Тел.: 267-65-10 — справка, 266-27-70(71) — предварительная запись.***

36,6°С

# ГРАЗІ З ВІТАМІНАМІ

**У Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння наступствы многіх хранічных захворванняў перамагаюць з дапамогай лекавых сродкаў прыроднага паходжання — сапрапелевых гразяў з экалагічна чыстага возера Судобль, што пад Мінскам, а таксама глеевых сульфідных гразяў Сакскага возера, што ў Крыме. Сцвярджаецца, дарэчы, што завезеныя гразі не губляюць сваёй каштоўнасці ў дарозе. Дзякуючы сакскім гразям, цэнтр бальнеалячэння пашырыў магчымасці аказання дапамогі ўсім, каму яна патрэбна. Падрабязна пра каштоўныя вартасці і паказанні для прымянення абодвух тыпаў гразяў расказвае намеснік галоўнага ўрача — загадчыца падраздзялення водагразелячэння Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Сафія ЛЕБЕДЗЬ.**

**— Гразелячэнне выкарыстоўваецца з даўніх часоў. У вашым цэнтры вось ужо больш за 20 гадоў прымяняюцца сапрапелевыя гразі і каля паўгода — сакскія. Чым яны адрозніваюцца і якія яшчэ гразі бываюць?**

— Для лячэння розных захворванняў выкарыстоўваюць сапрапелевыя, глеевыя сульфідныя, тарфяныя і сопкавыя гразі. У Беларусі выкарыстоўваюцца ўсе, акрамя апошніх. Сапрапелевыя ўтвараюцца за кошт разлажэння ніжэйшых раслінных і жывёльных арганізмаў у прэсных вадаёмах і вылучаюцца вялікім утрыманнем арганічных рэчываў. Утрымліваюць такія мікраэлементы, як кобальт, марганец, медзь, цынк, бор, малібдэн, ёд, бром, вітаміны В, С, Д, В12, рыбафлавін, фоліевую кіслату, а таксама антыбіётыкі і гармоны. Сапрапелі мякка ўздзейнічаюць на арганізм. Наш цэнтр карыстаецца сапрапелямі возера Судобль, што за 60 кіламетраў ад сталіцы, а ўвогуле разнастайныя сапрапелевыя адкладанні знаходзяцца ў шматлікіх азёрах на тэрыторыі былога Савецкага Саюза. Вялікія запасы сапрапеляў і стабільнасць іх фізікахімічнага складу даюць магчымасць шырока выкарыстоўваць іх як на курортах, так і ў іншых лячэбна-прафілактычных установах.

Глеевыя сульфідныя гразі ўтвараюцца на тэрыторыях галоўным чынам мінеральных, саляных вадаёмаў. Таму іх часта называюць мінеральнымі ці неарганічнымі: гразевы раствор багаты водарастваральнымі солямі і ў ім утрымліваецца адносна малая колькасць арганічных рэчываў. Лячэбны комплекс такой гразі ўтрымлівае, напрыклад, складаны ліпідны прадукт. А ліпіды выконваюць у арганізме ролю энергетычнага рэзерву і служаць асноўным матэрыялам для пабудовы клетачных мембран. Ім адводзіцца важная роля ў выспяванні і старэнні арганізма, стварэнні абарончa-кампенсаторных механізмаў пры парушэнні абмену, у развіцці атэрасклерозу і іншых паталагічных станаў. Ліпідны комплекс валодае выражанай антыбактэрыяльнай актыўнасцю ў адносінах да пэўных мікробаў і некаторых штамаў патагенных грыбкоў. Ліпіды гразяў бяруць удзел у процізапаленчым дзеянні апошніх. Адсарбцыйныя вартасці лячэбнай гразі праяўляюцца ў здольнасці паглынаць патагенную флору.

Неабходна заўважыць, што ў адрозненне ад медыкаментознага ўздзеяння з прымяненнем сінтэзаваных хімічных прэпаратаў, якія выклікаюць непажаданыя пабочныя эфекты, гразелячэнне з'яўляецца бяспечным, высокаэфектыўным спосабам перамагання многіх распаўсюджаных захворванняў.

**— У якіх выпадках сапраўды назіраецца паляпшэнне стану хворых? І якім чынам адбываецца ўздзеянне гразяў на арганізм?**

— Як сведчыць шматгадовая медыцынская практыка, па рэзультатыўнасці аздараўлення хворых падчас лячэння неўралагічных, уралагічных, гінекалагічных і многіх іншых захворванняў цяжка знайсці аналаг. З дапамогай тых жа сакскіх гразяў добрых вынікаў удаецца дасягнуць у лячэнні захворванняў мужчынскай палавой сферы, жаночай бясплоднасці, гінекалагічных запаленчых працэсаў, скурных, неўралагічных, стаматалагічных захворванняў, рэўматызму, хвароб апорна-рухальнага апарата. Лячэнне гразямі прыводзіць да выслабанення арганізма ад радыенуклідаў. Змяншае яго алергічную настроенасць, нармалізуе гарманальны фон і павышае імунітэт. Дзякуючы збалансаванаму мінеральнаму і арганічнаму складу гразь валодае супрацьзапаленчым, процімікробным, трафічным, рэгенеруючым уздзеяннем. Гразь бактэрыцыдная ў адносінах да стрэптакокаў, стафілакокаў, падаўляе развіццё прасцейшых — трыхаманад і грыбкоў.

> ***Лячэбныя гразі з Сакскага возера Крыма ў Мінску!***
>
> **Лячэнне захворванняў суставаў, пазваночніка, нервовай сістэмы, органаў дыхання, гінекалагічных, уралагічных і скурных хвароб!**

Варта дадаць, што адным з новых накірункаў выкарыстання бальнеагразевых прэпаратаў з'яўляецца іх паспяховае прымяненне ў касметалогіі. Бальнеагразевыя прэпараты аказваюць эфект ачышчэння, амаладжэння, паляпшаюць кровазварот скуры, павышаюць яе тонус, стымулююць рэгенератыўныя працэсы, стабілізуюць энергетычны абмен і нармалізуюць баланс тлушчу.

Гразі аказваюць складанае фізіялагічнае і тэрапеўтычнае дзеянне на арганізм чалавека перш-наперш сваімі тэмпературнымі, хімічнымі і механічнымі раздражняльнікамі. Вучонымі даказана, што актыўныя хімічныя і біялагічныя кампаненты пранікаюць у цела праз скуру і аказваюць уплыў на функцыі розных органаў, выклікаюць агульную рэакцыю, скіраваную на выздараўленне.

**— І ўсё ж такі гразелячэнне паказана не пры ўсіх захворваннях...**

— Безумоўна. Паказаннем найперш лічыцца, як было заўважана вышэй, захворванні апорна-рухальнага апарата, напрыклад, хранічныя артрыты, астэаартрозы, хваробы Бехцерава, астэахандроз, паражэнні мышцаў і сухажылляў, хваробы перыферычнай нервовай сістэмы — нейрапатыі, радыкуліты, станы пасля выдалення міжпазванковага дыска, хваробы палавых органаў — запаленчыя працэсы маткі і прыдаткаў, нярэдка выражаная функцыянальная недастатковасць яечнікаў, жаночая бясплоднасць, хранічныя прастатыты, эпідыдыміт, хваробы страўнікава-кішачнага тракта — язвавая хвароба страўніка і дванаццаціперснай кішкі, хранічны гастрыт, каліт, спайкі брушной поласці, хваробы органаў дыхання — хранічныя бранхіты, бранхіяльная астма, хранічныя запаленчыя працэсы вуха, сінусіты, танзіліты, скурныя хваробы — хранічныя формы экзэмы, нейрадэрміты, псарыяз.

Разам з тым гразелячэнне проціпаказана пры вострых запаленчых працэсах, злаякасных новаўтварэннях, міёмах, фібраміёмах, кістах яечнікаў, хваробах крыві, кровацячэннях і схільнасці да іх, туберкулёзе, артэрыяльнай гіпертэнзіі 3-й ступені, ішэмічнай хваробе сэрца 3-га і 4-га функцыянальных класаў, недастатковасці кровазвароту 2-й і 3-й ступеняў, камбінаваных пароках сэрца, анеўрызмах аорты і сэрца, варыкозным расшырэнні вен, выражаных формах атэрасклерозу і эндакрынных захворванняў, падчас цяжарнасці, пры псіхічных захворваннях, эпілепсіі, цырозе печані, інфекцыйных захворваннях у вострай і заразнай стадыі, індывідуальнай непераноснасці.

**— Што павінен ведаць пацыент, які вырашыў паспрабаваць пралячыцца з дапамогай прыроднага сродку?**

— Найперш варта пракансультавацца з урачом. Абавязкова давядзецца правесці агульны аналіз крыві, па паказаннях — мачы, зрабіць электракардыяграму. Падчас курса лячэння, які складае ў сярэднім дзесяць працэдур, неабходна будзе абмежаваць сябе ў псіхафізічных нагрузках, ужыванні алкаголю, курэнні, пазбягаць пераахалоджвання. Для дасягнення стойкага лячэбнага эфекту можна паўтарыць курс гразелячэння праз 6—12 месяцаў.

**Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.**

Выпуск № 5 (6)
9 чэрвеня
2007 года

# СВАЯ СПРАВА

БІЗНЭС, ЭКАНОМІКА, ФІНАНСЫ



# «АБСЭНТ» ПА-ПУТЧЫНСКУ

## На гасцінным і шчырым вясковым падворку ўсяго багата



Гэты вялізны корань жэньшэню дасць палёгку ад шмат якіх хвароб.

Таццяна Іванаўна з унучкай Уладзяй.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вёска Путчына, што на Дзяржыншчыне, мае вялікую гісторыю. Кажуць, што ёй ужо пяць стагоддзяў, а можа нават і больш. Побач са старажытнай вёскай — пасёлак з аднайменнай назвай, якому сёлета спаўняецца «ўсяго толькі» 75 гадоў. У 1932-м тут з'явілася першая на Дзяржыншчыне машынна-трактарная станцыя, якая абслугоўвала ўсе навакольныя калгасы. Размяшчэнне МТС было выбрана невыпадкова — месца ў цэнтры раёна і да ўсіх «кліентаў» можна дабрацца без усякіх перашкод. Прадпрыемства вялікае, таму «пад яго» цэлы пасёлак пачаў будавацца. Новы населены пункт атрымаў перспектыву — зараз тут цэнтральная сядзіба вялікай гаспадаркі, дзе ёсць і ўсе неабходныя сацыяльныя ўстановы (школа, дзіцячы садок, клуб, крама і г. д.). Сёлета «новае» Путчына атрымае статус аграгарадка. У суседняй старажытнай вёсцы ўжо мала жыхароў засталося — паступова адтуль моладзь калі не ў горад з'язджала, дык у суседні пасёлак перабіралася. Але надзея на будучыню застаецца — бусліха каля кожнай тутэйшай хаты ўвесну абавязкова прымае крылатых гасцей. Гэта добры знак.

Адкуль жа пайшла назва? Магчыма, прычынай стала зручнае размяшчэнне вёскі, на скрыжаванні шляхоў. Яшчэ больш верагоднай версія звязана з асаблівасцямі... мясцовай глебы. Тутэйшыя суглінкі ўвесну (асабліва падчас дружнай адлігі) быццам бы нейкая сіла знутры падымае, пучыць. Вось вам і назва, якая яскрава падкрэслівае адметнасць мясцін. Дакладней, адну з адметнасцяў, паколькі як зараз кажуць «фішак» тут вельмі многа. Гэта толькі на першы погляд здаецца, што ў глыбінцы мала што можа здзівіць, а на самай справе ў параўнанні з асобнымі вёскамі горад проста «адпачывае». Хіба можа выклікаць сапраўды дзіцячае здзіўленне казіно ці супермаркет? Напэўна ж не, а вось непаўторны каларыт беларускага падворка — гэта для многіх з нас новае, што, як у той прыказцы, проста нешта добра забытае з мінулага.

Летась адзначалася 860-годдзе Дзяржынска. У райцэнтры ладзілі вялікае свята, у якім, зразумела, бралі ўдзел установы культуры з усяго раёна. Кожная з іх на спецыяльнай пляцоўцы стварала сваю «інсталяцыю» вясковага падворка. Гэта, мабыць, была ці не самая цікавая частка шматлікіх мерапрыемстваў. У гасцей літаральна разбягаліся вочы — столькі ўсяго прадстаўлена. Путчынскі Дом культуры са сваім падворкам узяў «бронзу» — занялі ганаровае трэцяе месца. Аднак адна іх адметнасць дакладна запомнілася ўсім надоўга: путчынскі падворак быццам бы проста «пераехаў» са сваёй вёскі на гарадскую плошчу. Да таго ўсё было рэальна — і майстры з іх ручнікамі і кашамі, і гасцінны стол, і ветлівыя гаспадары, а таксама вясёлыя госці.

У ролі гарэзлівых і няўрымслівых гасцей — мясцовы калектыў народнай музыкі «Гуляначка». З канцэртамі гэты гурт аб'ездзіў увесь раён, і не толькі. З асаблівым пачуццём наведваюць менавіта аддаленыя вёскі, дзе артыстаў заўсёды чакаюць з вялікай асалодай. А на Сёмуху сёлета пабывалі на Стаўбцоўшчыне, у сваіх даўніх сяброў — ансамбля «Залужаначка». Там і «расшыфравалі» назву свайго калектыву.

— Мы заўсёды дорым людзям добры настрой, весялосць, таму і назва такая, — тлумачыць дырэктар Путчынскага сельскага Дома культуры Таццяна Карсакова. — Выконваем песні, якія па душы слухачам. І не толькі народныя, ёсць і аўтарскія — гэтым у нас Антон Анісовіч займаецца, ён складае вершы, піша музыку.

Таццяна Іванаўна нарадзілася і вырасла на Магілёўшчыне. Так склаліся абставіны, што ў Путчына яны разам з мужам пераехалі амаль чвэрць стагоддзя таму і цяпер могуць па праву лічыць сябе тутэйшымі. 20 гадоў Карсакова працуе ў Путчынскім Доме культуры (па-простаму — у клубе). Муж працуе інжынерам-механікам у мясцовай гаспадарцы. У Карсаковых двое сыноў: як кажа Таццяна Іванаўна, «старэйшы падпалкоўнік міліцыі, а малодшы яшчэ нежанаты, але хутка збіраецца ствараць сям'ю».

— Паўцякалі з вёскі, — узыхае маці, — аднак часта прыязджаюць дадому, памятаюць, што тут іх карані. Так, бадай, усе моладзь: у вёсцы любяць толькі адпачываць. Гэта наша пакаленне такое, што без працы людзі дрэнна сябе адчуваюць.

У Карсаковых вялікая гаспадарка, каля падворка — паўгектара зямлі. Было сваіх 25 сотак, яшчэ столькі ж ад суседзяў засталося (калі старыя памерлі, то іх дзеці ад участка адмовіліся). Так што работы з цягам часу не памяншаецца, а наадварот павялічваецца. Трэба паспець усё і на ўласным падворку зрабіць, і на працы. Так, Таццяна Іванаўна пра сваю «культурную работу» ніколі не забывае. У клубе заўсёды кожны можа знайсці сабе занятак па душы: моладзь на дыскатэках танцуе, праходзяць заняткі гурткоў, рэпетыцыі. Уся вёска збіраецца разам на святы. Асабліва тут любяць Купалле, якога вельмі чакаюць і да якога доўга рыхтуюцца. Самае таямнічае народнае свята ладзяць з выкананнем усіх неабходных абрадаў, і нехта з мясцовых абавязкова купальскай ноччу калі не папараць-кветку, дык свой лёс абавязкова напаткае. Галоўнае — верыць.

А яшчэ вельмі важна, лічыць Таццяна Іванаўна, каб захоўвалася пераемнасць: «калі будзем усё тое, што нам у спадчыну засталося ўзгадваць, то яно ў сэрца, у памяці захаваецца». А як яшчэ ў путчынскай зоне асаблівыя сакрэты таго самага гасціннага стала з'явіліся? Толькі ад бабуль, ад матуль.

— Ну, па-першае, мы вельмі славімся сваімі блінамі, — «па сакрэту» распавядае Таццяна Карсакова. — Нездарма ж тут так кажуць: «Блінок без смятанкі, як Чапаеў без тачанкі». З гумарам і ўсім зразумела, аб чым ідзе гаворка. У кожнай гаспадыні, вядома, ёсць свае «хітрыкі», таму ў бліноў атрымліваецца свой адметны смак і нават знешні выгляд адрозніваецца. Што яшчэ на стале? Дык як і ва ўсіх — агурочкі, сала, ды розныя іншыя вясковыя прысмакі.

А яшчэ Таццяна Іванаўна — вялікі спецыяліст па прыгатаванню разнастайных настоек. Колькі яна ведае рэцэптаў іх прыгатавання, падчас нашай размовы я так і не падлічыў. Усе неабходныя зёлкі (кожную — у свой тэрмін) Карсакова сама збірае і сушыць. У кожнай настойкі — свой лекавы эфект. Напрыклад, мятная быццам на душу кладзецца, супакойвае, яе можна лыжачку выпіць замест таблеткі валяр'янкі. Ёсць яшчэ настойкі на чаборы, святаянніку, хрэне і нават жэньшэні. Раней знакаміты корань вырошчвала адно малое прадпрыемства — непадалёк была цэлая вялікая плантацыя. Аднак, як кажуць, з-за цяжкасцяў са збытам (няўжо жэньшэнь застаўся незапатрабаваным?) з цягам часу ўчастак перасталі апрацоўваць і ён зарос пустазеллем. Аднак пры жаданні корань можна знайсці і зараз, каб, напрыклад, зрабіць лекавы экстракт. Выглядае амаль як сенсацыя, але, тым не менш: у Путчына ёсць і свой «абсэнт» — Таццяна Іванаўна робіць настойку і з палыну. Напой вельмі горкі, ён карысны для тых, каго пячайка замучыла. Варта зранку лыжачку выпіць, а пасля мёдам заесці — усё як рукой здыме. Прынамсі, такі рэцэпт Карсакова на сабе выпрабавала, кажа, што заўсёды дапамагае. Напоі жанчына яшчэ робіць і на ягадах, а таксама на мёдзе (медавуха ў яе, кажуць, вельмі смачная атрымліваецца). Настойваецца напой павінен сама менш тры тыдні, а які і месяц — у залежнасці ад «маркі». Колер у кожнай настойкі адметны атрымліваецца, так што без усялякіх этыкетак можна абыходзіцца. А яшчэ — заўсёды трэба меру ведаць, тады адчуеш сапраўдную асалоду ды і здароўе паправіш.

Такая вось вёска. Звініць яна зараз ад дзіцячых галасоў — канікулы. Да Карсаковых таксама ўнучка са сталіцы прыехала (дачка старэйшага сына). Уладзя ўжо вялікая — перайшла ў трэці клас. Дзяўчынка вельмі любіць спяваць народныя песні, у яе добры голас.

— Кажа мне: «Бабулька, буду жыць толькі ў цябе, у вёсцы», — кажа Таццяна Іванаўна. — Можа так яно і здарыцца, а можа і не. Але ж калі дзіця цікавіцца радзімай дзядоў і бацькоў, любіць сваю зямлю, то, напэўна ж, нядрэнным чалавекам вырасце.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
*Дзяржынскі раён.*

# «Салаўіны гай» Валодзькі



**Безумоўна, адзін з самых знакамітых і цікавых людзей на Пастаўшчыне — Герой Сацыялістычнай Працы Алег Адольфавіч Валодзька. Хочаш убачыць тысячу буйных свіней, якія вольна пасуцца ля шашы, сотню страусаў, фазанаў, трактар, што працуе на рапсавым паліве, і шмат чаго іншага цікавага, абавязкова трэба ехаць у гаспадарку «Навасёлкі-Лучай»: яе Алег Адольфавіч зрабіў знакамітай далёка за межамі Беларусі. Нядаўна карэспандэнт «Звязды» пабываў на непаўторным турыстычным комплексе гэтага СВК «Салаўіны гай».**

«Людзі! Жыццё — штука выпадковая і вельмі кароткая, старайцеся паспець зрабіць больш дабра, не чакаючы за гэта ўдзячнасці. Усё, што намі зроблена, зроблена для людзей, для уласнай душы, а не дзеля рэкламы», — такія словы часта гаварыць гэты чалавек сваім гасцям. І гэта не проста прыгожая фраза. Валодзька шчыра расказваў, што калісьці так не думаў. Але ж некалькі інфарктаў і клінічная смерць, напэўна, памяняюць думкі і вобраз жыцця ўсякага, хто хоча жыць і шануе лёс за права жыць далей. Землякі ведаюць, што часцей за ўсё чалавек-легенда ходзіць без абутку па зямлі, каб энергію добрую зямля давала, а дрэнную — наадварот.

Гасцей бывае па дзесятку аўтобусаў у дзень. Шмат і мясцовых людзей спецыяльна прыязджаюць ў кавярню сырзавода СВК «Навасёлкі-Лучай», каб з'есці смачныя стравы з экалагічна чыстых прадуктаў, некаторым падавай далікатэсы з мяса страуса і вялікую яешню з яго яйца, якое замяняе 10 звычайных яек і больш карыснае. Тут, на 19-м кіламетры трасы «Вільнюс—Віцебск», быццам трапляеш у будучыню. Нашу беларускую, дзе ўсё неяк рацыянальна, пры гэтым захоўваецца непаўторны беларускі стыль. У той жа кавярні столькі прыгожых старых рэчаў упрыгожваюць сцены, а ў цэнтры вялікай залы, дзе так смачна пахне дрэвам і нейкімі зёлкамі, — вялікі агмень. Так і хочацца сабрацца каля яго талакой. Дарэчы, Алег Адольфавіч упэўнены, што вяскоўцу, каб не жабраваць ды багацець, трэба не толькі малако здаваць, але і рамёствамі займацца, як гэта было ў даўніну.

Тыя ж страусы, быццам заўсёды тут і жылі. «Яны наогул прыручэнню не паддаюцца», — заўважае Алег Адольфавіч. — Вельмі неразумныя птушкі, вельмі, чамусьці, любяць усё бліскучае, асабліва ювелірныя вырабы! Быў у мяне адзін работнік, дарэчы, іншаземец, якому такім чынам не пашанцавала, шмат швоў медыкі наклалі на яго цела, калі страусы вырашылі лепш разглядзець нейкі пярсцёнак....» І калі некаторыя дамы з нашай дэлегацыі раптам перадумалі павітаць страусаў, гаспадар прапанаваў ім экскурсію на кані з коламі. Апошняе — таксама рэч рарытэтная. А купель 1838 года ля ўвахода ў комплекс! І такое тут ёсць.

Летась Алегу Адольфавічу споўнілася 60. А калгас узначаліў, калі яму было толькі 21. І менавіта дзякуючы яму калгас імя Суворава ў савецкія гады быў адным з лепшых. І ў XXI стагоддзі «на хвалях часу». Тое ж рапсавае паліва. Быў час, лічылі за такую ідэю яго дзіваком. Маўляў, зноў Валодзька эксперыментуе: навошта рапс яму вырошчваць? Ды яшчэ нейкую ўстаноўку па яго перапрацоўцы набыць хоча?... А працуе ўжо трактар нямецкай вытворчасці на алеі, ды расце рапс на плошчы пад 1000 гектараў. І на корм скаціне і птушкам заадно. Цэх гаспадаркі можа перапрацаваць не толькі такую колькасць расліны. І калі ў Еўропе ёсць ужо цэлыя АЗС, дзе прадаюць рапсавае паліва, у Беларусі, шкада, такіх энтузіястаў, як Валодзька, яшчэ не багата. А асабіста губернатар Прыдзвінскага краю ўпэўнены, што менавіта рапс для рэгіёна з не з самымі лепшымі кліматычнымі ўмовамі — культура вельмі перспектыўная: «Палова трактароў, камбайнаў і г.д. могуць перайсці на рапсавае паліва»....

Сыр, пельмені, хлеб і іншае робяць у гаспадарцы. А хлеб духоўны для Валодзькі — яго шчырая вера ў Бога. Храм вясковы ў Лучаі дапамог аднавіць, забяспечвае прыхаджан транспартам...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *Пастаўскі раён.*

## БЕЛАРУСЬ ГАНДЛЯВАЛА СА 149 КРАІНАМІ

**Паводле апошніх даных Міністэрства эканомікі краіны, наша рэспубліка ў першым квартале гандлявала са 149 краінамі свету.**

Айчынныя тавары пастаўляліся на рынкі 110 дзяржаў, а імпартавала Беларусь прадукцыю 136 краін. У студзені—сакавіку асноўнымі гандлёвымі партнёрамі нашай краіны з'яўляліся Расія, на долю якой прыходзілася 48,1 працэнта ўсяго аб'ёму тавараабароту, Нідэрланды — 7 працэнтаў, Германія — 6,1, Украіна — 5,9, Польшча — 4, Злучанае Каралеўства — 2,8, Латвія і Кітай — па 2,4, ЗША — 2,3, Італія — 1,7 працэнта.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ЛЮБІМЫ ДЗЕНЬ — СУБОТА

**Самай «запатрабаванай» датай гэтага лета ў мінскіх жаніхоў і нявест стане 7 ліпеня. У гэты дзень у кожным ЗАГСе сталіцы чакаюць каля 40 пар маладажонаў. Хоць звычайна рэгіструюць не больш як 25. Потым «гарачая» пара надыдзе з 4 па 11 жніўня.**

Дарэчы, самым папулярным днём рэгістрацыі шлюбу застаецца субота. Супрацоўнікі ЗАГСа Маскоўскага раёна правялі анкетаванне сярод моладзі. Высветлілася, што тыя, для каго рэгістрацыя шлюбу — далёкая перспектыва, больш лаяльна ставяцца да выбару дня тыдня і часу. Тыя ж, хто ў бліжэйшы час збіраецца пабрацца шлюбам, не хочуць рэгістраваць яго ў нядзелю, матывуючы гэта нязручнасцю для гасцей.

**Ганна ЛЕБЕДЗЕВА, «Мінск-Навіны».**

## Прадпрымальнікаў заклікаюць да супрацоўніцтва

Эксперты бізнэс-партала bel.biz запусцілі новы модуль www.reforma.bel.biz, які ўтрымлівае азначэнні і крытэрыі ўдасканальвання адміністрацыйных працэдур, спісы дзяржаўных органаў і арганізацый, працэдуры якіх будуць удасканальвацца.

Новы модуль быў распрацаваны па ініцыятыве Рабочай групы пры Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь і дае магчымасць прадстаўнікам бізнэс-супольнасці краіны прыняць удзел у рэформе адміністрацыйных працэдур для бізнэсу. Распрацоўшчыкі модуля прапануюць наведвальнікам уносіць свае прапановы ў электронным выглядзе аб паляпшэнні рэгулявання і спрашчэння адміністрацыйных працэдур. Прапановы бізнэсменаў, прадстаўнікоў аб'яднанняў прадпрымальнікаў на гэту тэму будуць кансалідаваны і накіраваны ў Рабочую групу для падрыхтоўкі змяненняў і дапаўненняў у адпаведныя заканадаўчыя акты краіны. Плануецца, што збор думак дзелавых людзей будзе завершаны ўжо ў верасні 2007 года. Дадзены Інтэрнэт-праект прапануе прадпрымальнікам Беларусі скарыстацца ўнікальнай магчымасцю і сумесна з экспертамі Мінэканомікі распрацаваць лепшыя ўмовы для развіцця бізнэсу ў краіне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# САД ЗАЦВІТАЕ НА СВІТАНКУ...

**Часлаў Станіслававіч Лабачэўскі ўвесь дзень на нагах. У ярка-аранжавай куртцы, «каб бачылі, што гаспадар на падыходзе», жартуе фермер, ён абыходзіць свае ўладанні — свае сады. Іх агульная плошча — ні многа ні мала — 20 гектараў.**



Свой першы кавалак зямлі ў 7 гектараў Часлаў Станіслававіч па рашэнню Астравецкага райвыканкама атрымаў у 1991 годзе. Адпрацаваўшы інжынерам у дзяржаўных установах, Лабачэўскі не пабаяўся стаць на свае ногі і зрабіцца першым на Астравеччыне фермерам. Сваёй гаспадарцы Часлаў Станіслававіч даў мілагучную назву— «Світанак». І ўласная гаспадарка сапраўды стала світанкам у яго жыцці.

— Спачатку было цяжкавата, — расказвае Лабачэўскі. — Сваіх сродкаў на пачатак справы не было. Добра, што пашчасціла ўзяць дзяржаўны крэдыт. На гэтыя грошы закупіў мінімум неабходнай тэхнікі. Гаспадарка пачала паўнацэнна працаваць, а пасля яшчэ і патрохі аддаваць укладзеныя сродкі — з'явіліся грошы на далейшае развіццё.

На пачатку свайго існавання фермерская гаспадарка спецыялізавалася на вытворчасці мяса-малочнай прадукцыі. Але ў хуткім часе Лабачэўскі прыходзіць да высновы, што накірунак трэба мяняць.

— Пры арганізацыі сваёй гаспадаркі, варта, у першую чаргу, арыентавацца на патрэбы рынку. Толькі калі ёсць попыт, мэтазгоднай з'яўляецца вытворчасць той ці іншай прадукцыі. У Беларусі на сёння вырошчваецца толькі 40 працэнтаў ад неабходнай колькасці яблыкаў. Прычым толькі чвэрць з іх трапляе на стол спажыўца ў выглядзе першасыравіны. У нашых шыротах можна вырошчваць цудоўныя сакавітыя плады, якія не трацяць сваіх якасцяў літаральна да чэрвеня. Дык чаго нам чакаць, пакуль польскія ці малдаўскія садаводы пачастуюць нас яблыкам? — кажа Лабачэўскі.

Менавіта паказчык попыту стаў штуршком для таго, каб накіраваць гаспадарку ў новае рэчышча — садаводчае. Цяпер «Світанак» стаў гадавальнікам. На яго тэрыторыі на продаж вырошчваюцца саджанцы пладова-ягадных культур. Час паказаў, што змена спецыялізацыі была вартая. Да таго ж аказалася, што ў Часлава Станіслававіча да садаводства ёсць не толькі цікавасць, але і здольнасці. Сам ён з усмешкай кажа: «Мабыць, у мінулым жыцці я быў садаводам». Канешне, для пачынання садоўніцкай дзейнасці мала адной зацікаўленасці, неабходны трывалыя веды ў гэтай галіне. Вопыт Часлаў Станіслававіч па кроплях чэрпаў і працягвае чэрпаць у паспяховых фермераў Германіі, Расіі, Украіны, Італіі, Галандыі, Літвы, Польшы, а таксама ў спецыялістаў НДІ пладаводства ў Самахвалавічах, Брэсцкага галіновага інстытута ў Пружанах, аналагічнага Гродзенскага ў Шчучыне.

— У справе садаводства, як і ў любой другой справе, неабходна пастаянна сачыць за інфармацыяй, апрацоўваць новае. У гэтым залог паспяховасці, — верыць фермер. І сам карыстаецца сваёй формулай. Дзейснасць гэтай формулы, як кажуць, у наяўнасці.

За 15 гадоў сваёй садоўніцкай дзейнасці Часлаў Станіслававіч Лабачэўскі дасягнуў многага. Вопытны садавод адзін паспяхова кіруе сваім фермерскім караблём. Ён у адной асобе і эканаміст, і бухгалтар, і рабочы, і гаспадар. Больш за тое, Лабачэўскі, праявіў здольнасці педагога і падрыхтаваў сабе чатырох памочнікаў. Строгі кантроль, працавітасць, веды гаспадара і добрасумленнасць памочнікаў дазваляюць паспяхова весці справу. Гаспадарка Лабачэўскага ўнесена ў Дзяржаўны рэестр вытворцаў пладова-ягадных дрэў і кустоў, што, бясспрэчна, з'яўляецца паказчыкам якасці вырашчаных саджанцаў. Дзякуючы прымяненню на практыцы інавацыйных тэхналогій па вырошчванню высакаякаснага пасадачнага матэрыялу фермерская гаспадарка «Світанак» выйшла на ўзровень сусветных стандартаў. Члены асацыяцыі «Белсадгадавальнік» прызначылі Лабачэўскага намеснікам старшыні.

Сёння Часлаў Станіслававіч вядзе гандаль з прадпрыемствамі і прыватнікамі Беларусі і Расіі. Сваім пакупнікам фермер прапануе высакаякасныя саджанцы яблынь, груш, вішань, агрэсту... Па ўсяму наваколлю разрастаюцца сады, што ўзялі разгон у світанкаўскім гадавальніку.

Але не толькі дзеля ўласнага прыбытку працуе Часлаў Станіслававіч. Сведчанне таму — яблыневыя сады, закладзеныя каля школ і ўстаноў Астравеччыны і суседніх раёнаў, саджанцамі якіх бескарысліва забяспечыў фермер.

**Таццяна КАЛТАН,
студэнтка 3-га курса
факультэта
журналістыкі БДУ.**
*Астравецкі раён.*

# Правілы прыёму... на работу

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

І яшчэ. Норма работы асобы ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў не можа перавышаць 23-х, а ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — 35-і гадзін у тыдзень. Прычым, адзначае Інэса Чысцякова, у гэтых выпадках аплата працы здзяйсняецца так, як і «дарослым» работнікам.

Што да верхняй «планкі», то яе па сутнасці няма. Амаль кожны можа працаваць да таго часу, пакуль дазваляюць сілы і здароўе. Хоць у агульным правіле ёсць і свае выключэнні. Так, максімальна магчымы ўзрост работы дзяржслужачых заканадаўства абмяжоўвае 65, а суддзяў Канстытуцыйнага Суда — 70 гадамі.

### У Мінска — асаблівы статус

Традыцыйна актуальная тэма — прапіска. Паводле слоў Інэсы Чысцяковай, зараз падчас працаўладкавання істотнай ролі яна ўжо не мае. Скажам, жыхар Магілёва можа працаваць у Гомелі, а жыхар Браслава — у Брэсце.

Аднак тут зноў-такі выпадае казаць аб адным выключэнні. Як кажуць, з улікам «асаблівага статуса» прапіска па-ранейшаму неабходна ў сталіцы. Дзеля справядлівасці, нельга не заўважыць, што ў Мінску практычна без перашкод могуць уладкоўвацца жыхары навакольных раёнаў — пры ўмове штодзённых паездак да месца работы і вяртання на пастаяннае месца жыхарства.

Для жыхароў іншых, больш аддаленых рэгіёнаў, правілы іншыя. Іх патэнцыяльным наймальнікам давядзецца атрымаць спецыяльны дазвол Мінгарвыканкама. Пры гэтым калі наймальнік пацвердзіць, што ён запрашае высокакваліфікаванага і патрэбнага гораду спецыяліста, такі дазвол можа быць бясплатным.

### Прыватнік вырашае самастойна

Адмаўляць у працаўладкаванні з прычыны ўзросту, полу ці, скажам, сацыяльнага статусу ў нас нельга. І ўсё ж адно абмежаванне ў заканадаўстве ёсць. Яно датычыцца сумеснай работы блізкіх сваякоў. Так, 27 артыкул Працоўнага кодэкса вызначае, што ў дзяржаўнай арганізацыі ці адасобленым падраздзяленні блізкім сваякам забаронена працаваць на пасадах кіраўніка, галоўнага бухгалтара, намесніка галоўнага бухгалтара і касіра. Такую ж забарону могуць вызначаць і арганізацыі недзяржаўныя. Аднак толькі па рашэнню непасрэдна ўласніка.

Прычым калі гэта норма парушаецца (і ў тым ліку ў выніку шлюбу), то выйсце можа быць толькі адно — звальненне аднаго з блізкіх сваякоў па ўласнаму жаданню або на падставе 44 артыкула Працоўнага кодэкса.

— Аднак варта звярнуць увагу, што мы вядзём размову выключна аб пералічаных вышэй асобах і пасадах, — падкрэслівае Інэса Чысцякова. — Таму, да прыкладу, у выпадку, калі муж працуе начальнікам цэха, а жонка з'яўляецца яго падначаленай, ніякіх парушэнняў няма. Як няма парушэнняў і ў сітуацыі, калі бацька займае пасаду кіраўніка прадпрыемства, а сын — пасаду начальніка цэха.

### «Праверка» з выключэннямі

Час выпрабавальнага тэрміну пры любой раскладцы не можа перавышаць 3 месяцы, і прызначаць яго ці не — справа наймальніка. Прычым у такі тэрмін не ўваходзяць перыяды часовай непрацаздольнасці, а таксама іншыя перыяды, калі работнік з пэўных прычын не выконваў свае абавязкі.

Разам з тым ёсць некаторыя катэгорыі грамадзян, у адносінах да якіх выпрабаванне забараняе заканадаўства. У прыватнасці, гаворка ідзе аб падлетках, маладых рабочых пасля заканчэння ПТВ і маладых спецыялістах пасля заканчэння вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, інвалідах, часовых і сезонных работніках, работніках, з якімі дасягнутая дамоўленасць аб пераводзе ў іншую мясцовасць ці да іншага наймальніка, а таксама работніках, якія прымаюцца па конкурсу або па выніках выбараў.

— Выпрабаванне можа быць вызначана толькі з адной мэтай — праверыць адпаведнасць работніка даручаным яму абавязкам, — кажа Інэса Чысцякова. — Таму калі выпрабавальны тэрмін закончыўся, і, як кажуць, работнік «падышоў», то ніякіх дадатковых загадаў прымаць ужо не трэба — чалавек проста працягвае знаходзіцца на сваім месцы. Калі ж высветліцца, што работнік са сваімі абавязкамі не спраўляецца, наймальнік можа скасаваць працоўны дагавор. Аднак тут варта мець на ўвазе: калі ініцыятыва скасавання зыходзіць ад наймальніка, то ён абавязаны прадаставіць доказы або ўказаць прычыны, што сталі падставай для такога рашэння, а таксама пісьмова папярэдзіць аб ім за тры дні да заканчэння тэрміну «праверкі». У крайнім выпадку папярэджанне можна прадаставіць нават у апошні дзень. Але галоўнае, каб такое звальненне не адбылося ўжо «за межамі» выпрабавальнага тэрміну.

Дарэчы, права скасаваць працоўны дагавор з выпрабаваннем мае і сам работнік. Для гэтага неабходна папярэдзіць наймальніка зноў-такі за тры дні. Пры гэтым тлумачыць, што стала прычынай для падачы заявы на звальненне, работніку зусім не абавязкова.

І таксама важны момант. Умова аб папярэднім выпрабаванні не заносіцца ў працоўную кніжку. Аднак адзначаецца ў працоўным дагаворы. Калі ж такой умовы ў дагаворы няма — адпаведна, работнік быў прыняты без «праверкі».

Між тым, адно з па-сапраўднаму няпростых пытанняў — ці можна заключаць з папярэднім выпрабаваннем кантракт, мінімальны тэрмін якога ў нас, як вядома, складае адзін год?

— Заключэнне кантракту з умовай папярэдняга выпрабавання магчыма, — падкрэслівае Інэса Чысцякова. — Прычым калі работнік «праверку» не пройдзе, наймальнік мае права гэты кантракт скасаваць датэрмінова — «па выніках» выпрабавальнага тэрміну.

### Пакет папер: нічога «лішняга»

Асноўны дакумент, неабходны для афармлення на работу, — пашпарт ці іншае пасведчанне асобы. Але не толькі. Наймальнік можа запатрабаваць дакумент воінскага ўліку, дыплом або іншы дакумент аб прафесійнай адукацыі ці прафесійнай падрыхтоўцы, а ў пэўных сітуацыях — таксама накіраванне на працаўладкаванне ў лік броні, пасведчанне інваліда і заключэнне МРЭК аб стане здароўя, іншае медыцынскае заключэнне, дэкларацыю аб даходах і маёмасці. Апроч таго, калі чалавек уладкоўваецца ўжо не першы раз, ён павінен прынесці працоўную кніжку. Аднак умова прад'яўлення працоўнай кніжкі не датычыцца сумяшчальнікаў.

— Па сутнасці патрабаваць ніякія іншыя дакументы сёння наймальнік не мае права, — працягвае Інэса Чысцякова. — Аднак не выключана, што ў будучым пры працаўладкаванні маладым спецыялістам спатрэбіцца і накіраванне на работу. Прынамсі, такую норму ўтрымлівае праект закона аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Працоўны кодэкс, які разглядаецца парламентам зараз.

### Страту «кампенсуе» дублікат

Даволі тыповая сітуацыя — страта пасведчання аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні. Або працоўнай кніжкі. Што рабіць у такім выпадку?

— Скідваць з рахункаў ролю пасведчання дзяржаўнага сацыяльнага страхавання нельга, бо ў рэшце рэшт гэта — пытанне сацыяльных гарантый работніку, — зазначае Інэса Чысцякова. — Аднак калі «зялёная картка» была і раптам знікла, то драматызаваць сітуацыю не трэба. Грамадзянін мае права звярнуцца да свайго ранейшага наймальніка з просьбай пасадзейнічаць у атрыманні дубліката. Або атрымаць такі дублікат самастойна — у раённым аддзеле Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Крыху іншы парадак аднаўлення працоўнай кніжкі. Тут на працягу 3 месяцаў пасля звальнення можна звярнуцца на ранейшае месца працы — былы наймальнік будзе абавязаны выдаць дублікат. А калі з моманту звальнення прайшло больш за 3 месяцы, то той жа былы наймальнік мусіць выдаць не дублікат, а даведку аб колішніх працоўных адносінах. А затым на падставе гэтай даведкі дублікат завядуць ужо па новаму месцы працы.

Прычым трэба паўтарыцца — размова ідзе менавіта аб дублікаце. І, як адзначае Інэса Чысцякова, афармленне дзвюх працоўных кніжак у любым выпадку супярэчыць закону.

### 20 гадзін — гэта «мяжа»

Напэўна, ёсць сэнс сказаць колькі слоў аб сумяшчальніках. Працаваць на ўмовах поўнага працоўнага дня па сумяшчальніцтву нельга. Працягласць працоўнага часу для гэтай катэгорыі не можа складаць больш за палову ад агульнай нормы — інакш кажучы, максімум 20 гадзін у тыдзень.

— Сапраўды, сумяшчальнік можа выконваць работу не штодзённа, а, да прыкладу, у выхадныя па асноўным месцы дні, — заўважае Інэса Чысцякова. — У такіх варунках занятасць па сумяшчальніцтву на працягу поўнага 8-гадзіннага або 12-гадзіннага дня ўжо дапускаецца. Аднак зноў-такі: сумяшчальніцтва ўсё роўна не можа працягвацца больш чым 20 гадзін у тыдзень. І ў адваротным выпадку мы вымушаны канстатаваць парушэнне працоўнага заканадаўства.

### Студэнт з працоўнай кніжкай

Нарэшце, не менш папулярнае пытанне — ці можа ўладкавацца на поўную стаўку студэнт дзённага аддзялення?

— Безумоўна, можа — у прыватнасці, калі работа на працягу поўнага дня не перашкаджае навучанню, — тлумачыць Інэса Чысцякова. — Дарэчы, чамусьці ў нас склалася меркаванне, што працуючы студэнт з'яўляецца сумяшчальнікам. Гэта не так, бо студэнт не працуе ў іншым месцы і не мае іншага працоўнага дагавора. А значыць, будаваць працоўныя адносіны з ім неабходна па ўсіх правілах — і ў тым ліку з афармленнем працоўнай кніжкі. Прычым працоўная кніжка афармляецца і тады, калі студэнт прымаецца толькі на палову стаўкі.

**Сяргей ГРЫБ.**

Дыплом серыі А № 0131941, выдадзены 28.07.1999 г. Гомельскім сярэднім пажарнатэхнічным вучылішчам на імя Малеева Дзяніса Анатольевіча, лічыць несапраўдным.

*Выпуск № 3 (8).*

## Добры дзень, родныя словы!

# Крышку аб «крышцы»

У сваім лісце ў рэдакцыю мінчанка ветэран працы Ганна Жабінская піша, што з нагоды сямейнай урачыстасці купіла рознага пітва. І на прыгожай наклейцы прачытала, што тэрмін захоўвання пададзены «на **крышцы** бутэлькі». І далей зазначае: «Пітво добрае, а надпіс благі. Няўжо на заводзе забыліся пра слова **«накрыўка»**. Не называю завода, бо рэдка сустракаю сёння надпіс на беларускай мове. А тут было хоць добрае памкненне».

Слушная заўвага, паважаная Ганна Феліксаўна!

Сапраўды, слова **«накрыўка»** абазначае ўсё, чым што-небудзь накрываюць. Яго суфікс добра падыходзіць да назвы і малога і вялікага посуду. Накрыўкі розных памераў накрываюць адпаведна бутэлькі, бутлі, гаршчкі, глякі, цёрлы, макотры, збаны, чыгуны, каструлі…

У чамадана (валізкі), каробкі, скрынкі — адпаведна **«верх».**

Дзежка прыкрываецца **векам**. У дзежачкі ж ёсць сваё **вечка**. **Векам** закрываецца і труна, праводзячы нас у апошнюю дарогу.

А цяпер чарга і да рускага фразеалагізма **«от крышки до крышки»** (ад пачатку да канца, поўнасцю, нічога не прапускаючы). У нас свой даўні адпаведнік — **ад дошкі да дошкі.** У старажытнасці ў кніг замест сённяшніх вокладак былі яны — драўляныя дошкі, дубовыя, букавыя, кляновыя…

У рускай мове ёсць яшчэ і такія ўжыванні: … **крышка** (каму-, чаму-небудзь)! (И) **крышка**. У значэнні выказніка яны могуць абазначаць: а) пагібель, канец. Тады па-беларуску гэта **капут, каюк, канец, канцы, капец, капцы, халэмус.**

Або б) закончана, завершана, гатова (што-небудзь). Напрыклад: **Взял подписал и крышка.** Узяў падпісаў і гатова.

Вунь колькі ў нашай мове розных адпаведнікаў да рускай **«крышки».** Так што пазычаць нам гэтага слова ані не прыстала. Бо свайго дабра даволі.

**Рубрыку вядзе Анатоль КЛЫШКА.**

# Пракуроры малююць, фатаграфуюць, вышываюць...

**У гэтым пераконваешся, калі пабываеш на выставе творчых работ пракурорскіх работнікаў Гомельскай вобласці.**

Вось карціны старшага следчага па асоба важных справах Яўгена Гаўрыленкі, які ў дзіцячым узросце закончыў мастацкую школу. Пейзажы, нацюрморты — любімыя тэмы яго твораў, выкананыя акварэллю, гуашшу, алейнымі фарбамі і каляровымі алоўкамі. Захапленне выяўленчым мастацтвам у Яўгена Фёдаравіча, відаць, не выпадковае, бо ён з'яўляецца блізкім родзічам вядомых беларускіх мастакоў Паўла Гаўрыленкі і Міхаіла Савіцкага.

Цікавыя фатаграфіі і ў Леаніда Браткоўскага, які працуе ў пракуратуры 35 гадоў. На яго здымках родныя краявіды, вясковыя і гарадскія пейзажы. А ў памочніка пракурора Цэнтральнага раёна Іны Сарасека іншае хобі — вышыўка, якой яна навучылася ў сваёй бабулі з вёскі Неглюбка Веткаўскага раёна, вядомай у краіне сваімі таленавітымі ткачыхамі і вышывальшчыцамі ручнікоў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Тэлесеткі

# Музычныя вечары на ўсе густы

**Да свайго першага юбілею канал АНТ падрыхтаваў гледачам падарунак. І не адзін, а цэлых шэсць. Менавіта столькі разнапланавых канцэртаў адбудуцца ля сцен архітэктурнай жамчужыны Беларусі — Мірскага замка.**

Адкрые гэтую серыю 22 чэрвеня канцэрт класічнай музыкі: аркестр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі пад кіраўніцтвам Вячаслава Воліча прадставіць лепшыя творы беларускіх кампазітараў. Салісты беларускай оперы выканаюць шэраг знакамітых арый.

У гэты ж дзень (дакладней, ноч: канцэрты праходзяць парамі і пачынаюцца ў 21.30 і 23.30 адпаведна) выступіць легенда айчыннай эстрады — ВІА «Верасы» — з праграмай «Залатыя песні Верасоў». У канцэрце будуць прадстаўлены ўсе саставы знакамітага калектыву. А завершыцца першая музычная ноч у Мірскім замку яскравым і відовішчным феерверкам.

23 чэрвеня прадставіць сваю новую праграму Дзяржаўны ансамбль «Харошкі». Крыху пазней гледачам будзе прапанавана «Дыскатэка 80-х» з удзелам зорак замежнай і савецкай сцэны: Bad Boys Blue, London Beat, Fancy, Baccara, «Арыэль», ВІА «Спяваючыя гітары» і іншых.

24 чэрвеня адбудзецца летняя «выязная» серыя хіт-парада «Песні года Беларусі». Удзельнікі канцэрта традыцыйна выбіраюцца, зыходзячы з рэйтынгаў вядучых FM-радыёстанцый — кожная складае спіс з 10 найбольш папулярных выканаўцаў, чые песні на працягу вясновых месяцаў гучалі ў эфіры часцей за ўсё. Весці канцэрт будуць вядомыя дыджэі радыё і вядучыя АНТ. А лепшую песню сезона, як заўжды, вызначаць тэлегледачы — шляхам інтэрактыўнага галасавання.

Фіналам музычных вечароў у Мірскім замку стане грандыёзнае тэатралізаванае шоў «Купалле Ірыны Дарафеевай. Фестываль стыхій». Вядомая спявачка выступіць у суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна, прычым будзе спяваць не толькі сольна, але і са сваімі калегамі-сябрамі — напрыклад, запланаваныя дуэты з Русланам Аляхно і Аляксандрам Панамаровым.

Уваход на ўсе канцэрты, як паведамілі нам у прэс-службе АНТ, вольны. Для гледачоў таксама прадугледжаны атракцыёны, вулічныя кафэ і нават палатачны гарадок — калі нехта пажадае застацца на ўсе «музычныя выхадныя».

**Віктoрыя ЦЕЛЯШУК.**

## Выстава

# Пра што расказала аблачынка

**Вучні майстра Вячаслава Дубінкі прыдумалі казку і самі ж зрабілі ілюстрацыі-выцінанкі да яе. А галоўным героем гэтай казкі стала воблака, якое з'явілася над Чарнобылем пасля аварыі.**

Выставу «Расказы, аблачынка», якая прыехала ў сталіцу з Чачэрскага раёна, можна пагледзець у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі. Яна арганізавана ў рамках міжнароднага праекта, які мае на мэце супрацоўніцтва дзеля рэабілітацыі ўмоў жыцця ў пацярпелых ад катастрофы раёнах. Дзеля таго, каб захоўваць памяць аб катастрофе, быў заснаваны праект, удзельнікамі якога сталі школьнікі з 10 краін свету. Усе яны стваралі сваю казку на зададзеную тэму пад кіраўніцтвам прафесійных майстроў. У Чачэрскім раёне Беларусі з дзецьмі займаецца Вячаслаў Дубінка, член Саюза майстроў народнай творчасці Беларусі. Ён быў адным з першых, хто ў сярэдзіне шасцідзесятых адрадзіў унікальны від мастацтва выразання з паперы. Яго выцінанкі атрымлівалі прэміі на прэстыжных сусветных конкурсах.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Памяць

# Без яе... і з ёй звіняць цымбалы!

У Паставах напярэдадні ўжо дзесятага Міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» адбылася вечарына памяці Ніны Маркаўны Захарэвіч. Спачатку землякі ведалі яе як настаўніцу фізікі і матэматыкі, як інспектара РАНА, дырэктара школы, як старшыню райкама прафсаюза работнікаў асветы... І толькі потым — як паэтку, бо пісаць Ніна Маркаўна стала не ў 30 і нават не ў 40...

Што, аднак, не перашкодзіла ёй многае паспець. У тым ліку — і на гэтай ніве: пайшлі ў народ сотні яе заліхвацкіх прыпевак і гумарэсак, 4 зборнічкі вершаў.

Пяты зборнічак (на вялікі жаль — ужо без яе) прэзентаваўся падчас вечарыны. На відэаэкране ўсплывалі фотаздымкі, гучалі ўспаміны, вершы, песні на яе словы. І здавалася, што аўтар іх па-ранейшаму тут, на зямлі. І паранейшаму нясе людзям святло дабрыні і спагады, святло чалавечай мудрасці і мужнасці, святло прыгажосці. У тым ліку і роднага крывіцкага слова, бо напісанае — яно застаецца.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# «Рок за Баброў»

**У Бабруйску 2 чэрвеня прайшоў музычны фестываль «Рок за Баброў». На пляцоўцы каля Палаца мастацтваў сабралася прыкладна 20 тысяч гледачоў. Лепшыя рок-каманды Беларусі ігралі для іх 6 гадзін бесперапынна.**

Сёлета ў горад на Бярэзіне прыехалі 10 каманд. З найбольш папулярных — «Ляпіс Трубецкой», «J:МОРС», «Стокс», гомельская група «ТТ-34». Спецыяльна запрошаным госцем была група са Смаленска «Дэймос». Завяршыўся канцэртны марафон феерверкам. Арганізацыяй і фінансавай падтрымкай фестывалю традыцыйна займаецца піваварня «Сябар». Фестываль «Рок за Баброў» — не проста музычнае свята, яно мае экалагічную і сацыяльную нагрузку.

«Экалогія павінна хваляваць усіх!» — лічыць кіраўніцтва кампаніі «Сябар». Падчас фестывалю грамадскае аб'яднанне «ЭКАДОМ» разгарнула кампанію па абмену пластыкавых пакетаў, якія цяжка паддаюцца ўтылізацыі, на модныя палатняныя кайстры. На фестывалі прайшла таксама акцыя «Я люблю Бабруйск!» Сотні шарыкаў з такім надпісам былі адначасова запушчаныя ў паветра.

Жыхары Бабруйска засталіся задаволеныя і маляўнічым відовішчам, і добрым канцэртам. З кожным годам «Рок за Баброў» прыцягвае ўсё больш гледачоў і ўдзельнікаў, і ў наступным годзе фестываль плануецца правесці ўжо чацвёртым разам. Сёлета «Сябар» парадуе бабруйчан яшчэ адным фестывалем: у сярэдзіне ліпеня тут адбудзецца свята этнамузыкі «Вольнае паветра». Паводле планаў, на яго запросяць шмат гасцей з Расіі, у тым ліку выказаў сваю зацікаўленасць вядомы музычны крытык Арцемій Троіцкі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Глядзіце!

# ДАРАФЕЕВА ПРАЙШЛА ПРАЗ АГОНЬ І ПАЛЯТАЛА Ў СНЕ

### *На працягу трох дзён спявачка паспела зняць тры кліпы*



**Пасля леташняга поспеху відэа на песню «Вышыта сарочка» Ірына Дарафеева вырашыла працягнуць супрацоўніцтва з вядомым кліпмейкерам Сашай Бутар. «На адкуп» рэжысёру былі аддадзены адразу дзве песні: «Балада» і «Рэчанька».**

— Гэтыя песні сталі ўжо для мяне знакавымі, любімымі, спадзяюся, любімымі і для слухачоў, таму экранізаваць мы вырашылі менавіта іх, — расказала Ірына. — Спачатку здымалі ў Заслаўі маляўнічую карцінку для «Балады»: па сюжэту, рыцараў сабралі на вайну, туды пайшоў і каханы чалавек маёй гераіні; дзяўчына адправілася яго выручаць, але ўжо было позна... Сумная, але вельмі прыгожая гісторыя. «Рэчаньку» здымалі ў Салігорску, і гэта было ўвогуле нешта неверагоднае. Не ведаю, што атрымаецца ў выніку. Але Саша прымусіла мяне рабіць усё: давялося блукаць па смецці, праходзіць праз агонь, бегаць, падаць, рваць сукенку... Я была ўся ў драпінах, але экспрэсія сюжэта, відаць, таго вымагала.

Партнёрам Ірыны ў абодвух кліпах выступіў акцёр Аляксандр Яфрэмаў. Дарэчы, мяркуючы па апісанню краявідаў — кар'еры, саляныя рэкі і горы, — частка «Рэчанькі» здымалася там жа, дзе беларускія рэжысёры рабілі відэаверсію песні «Я здесь» для знакамітага расійскага гурта «Арыя». Толькі замест змрочнай апакаліптычнай карцінкі для Ірыны, наадварот, стварылі атмасферу выраю, дзеля чаго давялося здымаць нават пад вадой...

Леташнія здымкі праходзілі ў надзвычай халоднае надвор'е, і дзяўчатам у лёгкіх кашулях давялося памерзнуць, імітуючы Купалле. Сёлета, наадварот, экстрыму дабавіла гарачыня:

— У Салігорску я была ў чорнай сукенцы, да таго ж з сінтэтыкі. А трэба было даволі доўга стаяць на сонцапёку, не мяняючы позу, — паскардзілася спявачка. — Уся здымачная група добра-такі абгарэла. Мне таксама дасталася: плечы, нос... Увогуле, гэтыя дні былі сапраўды экстрэмальнымі: мы выязджалі ў ноч, а пятай раніцы прыязджалі ў Салігорск і там з поўнай аддачай працавалі. А дагэтуль я вярнулася з выступлення ў Гомелі, таксама позна ноччу, і былі яшчэ напружаныя здымкі ва Уладзіміра Янкоўскага, ён рабіў нам з Русланам Аляхно кліп на песню «Сэрца зямлі маёй». А чацвёртай раніцы прыехалі на Іслач, каб здымаць світанне. Атрымліваецца, тры кліпы ішлі ў рэжыме нон-стоп, з дзвюма бяссоннымі начамі і трохсутачнай напружанай працай. Але ўсё было вельмі цікава.

Наконт сюжэта кліпа «Сэрца зямлі маёй» Ірына Дарафеева выказалася проста: «Рэжысёр здымаў жывапіс, надзвычай прыгожы, ён літаральна зачароўвае». Уладзімір Янкоўскі стварыў сапраўднае мінікіно, прысвечанае Беларусі, у аснове якога — гісторыя кахання, з дзіцячых гадоў (Ірыну і Руслана падмянялі ў гэтых сцэнах маленькія дублёры) да сталасці. «Напэўна, гэта песня пра чалавека, які шчаслівы тым, што ягонае сэрца б'ецца, што ён жыве і што ён шчаслівы на роднай зямлі», — «пераказала» спявачка агульны настрой. Галоўнай загадкі відэа яна так і не раскрыла, намякнуўшы толькі, што яна будзе... лятаць, як быццам у сне.

— Я задаволеная гэтым дуэтам. Руслан сапраўдны артыст, з ім было вельмі лёгка і прыемна працаваць — я нават не ведаю, ці атрымалася б так раскрыцца з кім іншым. Ён уклаў у песню душу, адчуваецца вялікая настальгія па роднай Беларусі, такая любоў... Добра, што ягоны прадзюсар і кампазітар Кім Брэйтбург пастаянна падтрымлівае нейкія сумесныя праекты — напрыклад, ідэя гэтага дуэта выношвалася два гады. Нарэшце, яе ўдалося рэалізаваць. Думаю, выйдзе нешта шэдэўранае, як сказаў Уладзімір Янкоўскі...

5 чэрвеня відэакліп «Сэрца зямлі маёй» быў ужо гатовы і, па сведчанні яго першых гледачоў — супрацоўнікаў тэлеканала АНТ, атрымаўся калі не шэдэўраным, то вельмі блізкім да гэтага вызначэння. Сваю ацэнку зможам даць і мы ўсе: прэм'ера відэа адбудзецца сёння ў праграме «Наша раніца», а таксама заўтра ў «Ранішняй пошце» і пасля «Контураў».

**Віктoрыя ЦЕЛЯШУК.**

## Ёсць нагода

# КОЖНАМУ ПА СВЯТУ

### Дзіўным нагодам прысвячаецца...

**Прывітанне, сябры! Ці гатовыя вы да святкавання? Я не памылілася — ні са зваротам, ні з нагодай. Бо сёння, 9 чэрвеня, у свеце адзначаецца Міжнародны дзень сяброў (па іншых звестках, ён прыпадае на 15 ліпеня).**



Куды паглыбляецца каранямі гэта свята, гісторыя змоўчвае — але ці так гэта, зрэшты, істотна? Сяброўства — у любым выпадку з'ява каштоўная і вартая свайго асобнага свята. Як заўважыў Артур Шопенгаўэр, «Сапраўднае сяброўства — адна з тых рэчаў, аб якіх, як аб гіганцкіх марскіх змеях, невядома, з'яўляюцца яны прыдуманымі або насамрэч дзесьці існуюць». Калі вы можаце пахваліцца тым самым, сапраўдным — вам, як кажуць, і карты ў рукі. Не забудзьцеся прыгадаць усё самае добрае, і ад душы павіншаваць таго чалавека (ці многіх людзей), проста з тым, што ён/яны ў вас ёсць. А ўжо як адсвяткаваць, дружная кампанія заўжды знойдзе... Дарэчы, сёння ж, у другую суботу чэрвеня, адзначаюць сваё прафесійнае свята півавары — але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

У рэдакцыі калегі, даведаўшыся пра Дзень сяброў, першай справай чамусьці спыталіся, а які дзень тады адведзены ворагам. Мы старанна «пералапацілі» бібліятэкі і Інтэрнэт, і высветлілася, што Дня ворагаў не існуе ў прыродзе (а шкада, шчыра кажучы, — некаторым даўно хочацца сказаць колькі слоў). Гэтаксама ў ніводным календары няма Дня вайны, Дня нянавісці і іншых «адмоўных» дат. А што тады ёсць?

### Звыклыя і экзатычныя

Нікога не здзівіш паведамленнем, што ў ноч з 31 снежня на 1 студзеня надыходзіць Новы год. А вось ці многія ведаюць, што 1 студзеня — Міжнародны дзень міру? Ён жа — Дзень сусветных малітваў аб міры. Абвешчаны гэты дзень Папам Рымскім Паўлам VI і адзначаецца як афіцыйнае каталіцкае свята з 1968 года. А 1 красавіка, акрамя знакамітага Дня дурня або Дня смеху, святкуюцца яшчэ Міжнародны дзень птушак — ва ўсім свеце, і Імяніны дамавіка — старое славянскае свята, з якога, як мяркуюць многія даследчыкі, і пачалася традыцыя розыгрышаў і жартаў над аднасяльчанамі.

Аматары публічнага выяўлення пачуццяў могуць смела дапісаць у свае нататнікі акрамя Дня ўсіх закаханых (14 лютага) наступныя важныя святы: сусветны Дзень абдымкаў (хто прыдумаў, зараз ужо не разбярэшся, а абдымаюцца сустрэчныя-папярэчныя ўжо некалькі гадоў запар 21 студзеня), Дзень пацалункаў (гэты «абмен душамі» прапанавала свету Вялікабрытанія, а крыху пазней дату ўсеагульных пацалункаў — 6 ліпеня — зацвердзіла такая паважаная арганізацыя, як ААН) і больш сціплы, але не менш неабходны Дзень прывітанняў і добрага настрою (прыдумалі ў 1973 годзе браты Маккормак і прызначылі для гэтага дзень 21 лістапада). А вось для выказвання ўдзячнасці існуе асобны дзень — 11 студзеня адзначаецца сусветны Дзень «дзякуй» — усім, хто гэтага варты, і за ўсё добрае.

Але гэта што датычыцца святаў пазітыўных. Ёсць у міжнародным календары і сумныя даты, якія нагадваюць грамадскасці аб нявырашаных праблемах: Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакоста (27 студзеня), Дні памяці і прымірэння, прысвечаныя ахвярам Другой сусветнай вайны (8—9 мая), Міжнародны дзень нявінных дзяцей — ахвяр агрэсіі (4 чэрвеня), Сусветны дзень бежанцаў (20 чэрвеня), Міжнародны дзень інвалідаў (3 студзеня) і г.д.

Зразумела, акрамя святаў агульных — народных, рэлігійных, дзяржаўных, сусветных — хапае і «спецыялізаваных». Практычна кожная прафесія на Зямлі мае свой дзень, няхай гэта бортправаднікі (12 ліпеня), рыэлтары (15 снежня), сістэмныя адміністратары (28 ліпеня), штурманы ВМФ (25 студзеня, адначасова са студэнтамі), бармены (6 лютага), паэты (21 сакавіка), сакратары (25 красавіка), спартыўныя журналісты (2 ліпеня), інкасатары (1 жніўня) або шэфы і кіраўнікі ўсіх узроўняў (16 кастрычніка). Пералічваць усе — напэўна не хопіць не толькі газетнай старонкі, але і звычайнага цярпення, тым больш, што прафесіяналы пра «сваё» свята інфармаваныя лепш за каго іншага.

Некаторыя святы інакш, як дзіўнымі, не назавеш. Цяжка ўявіць, напрыклад, якім чынам трэба адзначаць сусветны Дзень туалета (прыпадае на 19 лістапада, існуе з 2001 года)? Або Дзень знішчэння ваеннай цацкі (7 верасня)? А што рабіць з сусветным Днём чачоткі (25 мая), асабліва, калі вам мядзведзь і на вуха наступіў, і ногі як след адтаптаў? Акрамя ўжо названых, даюць прастору для фантазіі такія забаўныя дні, як «Памідорына» (адзначаецца ў Іспаніі ў апошнюю сераду жніўня і заключаецца ў тым, што людзі кідаюцца адзін у аднаго перасапелымі таматамі, пакуль плошча не ператворыцца ў суцэльнае мора кетчупу), або сусветны Дзень без машын (23 верасня), Ноч маці (20 студзеня), Дзень Блума (16 чэрвеня; ніякага дачынення да галівудскага акцёра не мае — насамрэч так ірландцы шануюць «Уліс», бо дзеянні ў рамане разгортваюцца менавіта 16 чэрвеня)... Карацей, з такім рэжымам святаў не засумуеш — хутчэй, пачнеш задавацца пытаннем, ці застаўся хоць адзін дзень, у які зусім нічога не адзначаецца.

### Які месяц самы «ўраджайны»?

Калі прагледзець каляндар міжнародных святаў, што адзначаюцца ААН, то самым насычаным атрымліваецца кастрычнік — 12 розных падзей. Найменш пашанцавала студзеню і лютаму — усяго па аднаму святу на месяц.

Мяркуючы па каляндарнаму парталу www.calend.ru, які ўтрымлівае пералік самых розных святаў — нацыянальных, славянскіх, канфесійных, міжнародных, прафесійных, язычніцкіх і нават акультных — самы «святочны» месяц, прынамсі, у гэтым годзе — май (149 святаў, у сярэднім амаль па 5 на дзень). Крыху менш напружаны лістапад і кастрычнік (146 і 140 святаў адпаведна), і ўжо зусім спакойны студзень («усяго» 100 нагод для адзначэння).

У чэрвені ж, напрыклад, нас чакаюць яшчэ 5 каталіцкіх, 5 праваслаўных, 6 агульнаславянскіх, 6 міжнародных, 4 прафесійныя і 3 дзяржаўныя святы. Многа? Мала? Каму як...

**Святочны каляндар гартала Віктoрыя ЦЕЛЯШУК.**

# А якое свята вы дабавілі б у каляндар?

### З гэтым пытаннем мы звярнуліся «ў народ»

***Юрый ЛАБАЧОЎ, школьны настаўнік:***

— Вызначыў бы дзесьці напрыканцы вясны—напачатку лета Дзень школы. Натуральна, існуе дзень настаўніка, калі вучні дораць кветкі і кажуць табе добрыя словы, ёсць дзень выпускнікоў у першую суботу лютага, ёсць таксама экзамены (памятаеце: «Прафесар, экзамен для мяне — заўжды свята!») і выпускныя вечары — як свята развітання са школай. Але ўсе яны праходзяць арганізавана, я сказаў бы, нават часам заарганізавана. А Дзень школы, на маю думку, мог бы стаць тым святам, у якое вучні ці іх бацькі, ці колішнія выпускнікі маглі б прыходзіць і рабіць для сваёй «альма матэр» штосьці добрае. Калі яны, канешне, адчуваюць удзячнасць да школы і да сваіх настаўнікаў.

***Алена МЯТЛІЦКАЯ, бухгалтар:***

— Я нічога не стала б дабаўляць, наадварот, магчыма, некаторыя святы выкрасліла б. Хто хоча, той самастойна наладзіць сабе свята хоць кожны дзень, а калі «гулянкі», скажам, у студзені ці маі зацягваюцца на тыдні, ад гэтага ў рэшце рэшт церпіць і якасць работы, і самі людзі: страўнікі ж не купленыя. Мне здаецца, нам трэба яшчэ доўга «цывілізавацца», асабліва для правядзення масавых святаў — тады не важна, колькі іх у календары, важна, каб адзначылі з душой і працягнулі паўсядзённую дзейнасць з задавальненнем.

***Таццяна МЕДЗЯНІК, супрацоўнік аддзела продажаў:***

— Мне здаецца, часам неабходна свята зламанага тэлефона — каб не працаваў ні працоўны, ні мабільны, ніхто не псаваў табе настрой або не даваў невыканальных планаў. Адзначала б яго, скажам, раз на месяц — каб нарэшце сустрэцца з многімі людзьмі, гледзячы вочы ў вочы, пагаварыць падрабязна, бо тэлефонныя дамоўленасці вельмі часта адмяняюцца або застаюцца толькі размовамі. Увогуле, нялішне было б паменш карыстацца тэхнікай і больш увагі аддаваць менавіта жывым стасункам, тады і менш непаразуменняў узнікала б.

***Уладзімір МАКСІМКОЎ, прадзюсар:***

— Відаць, я выдаліў бы з календара дзесяткі два дзён, якія невядома чаму лічацца святамі. Рэальна ў жыцці чалавека ўсяго тры—чатыры важныя даты: уласны дзень нараджэння і дні народзінаў родных, традыцыйны Новы год і пэўныя святы, звязаныя з веравызнаннем, у залежнасці ад канфесіі. Інтэлігентным людзям, я лічу, дзеля таго, каб сустрэцца і добра пасядзець, увогуле не патрэбныя штучныя нагоды.

***Кацярына АНІСІМАВА, супрацоўнік МНС:***

— Думаю, пры сучасным рытме жыцця, з яго штодзённымі стрэсамі, бытавым хамствам і іншым негатывам, не пашкодзіў бы Дзень пазітыву і любові. Проста каб ніхто ні да каго не чапляўся ў гэты дзень, усміхаўся прахожым і сваім думкам. Можна рабіць прыемныя рэчы і выказваць свае сімпатыі (не абавязкова чалавеку супрацьлеглага полу), парыцца з тымі, з кім пасварыўся. Кветкі прапаную ў гэты дзень забараніць — як банальны ход. Не трэба нам абавязковай святочнай праграмы, няхай будзе адвольная. Калі адзначаць? 30 мая. У мяне якраз дзень нараджэння!

## На конкурс апавяданняў

***Апавяданне журналіста са Старых Дарог Алеся Лісіцкага адметнае напружанасцю дзеяння, спакойнай і ўпэўненай інтанацыяй, за якімі адчуваецца далёка не пачатковец. Сталая культура пісьма і мовы ператварае звыклае сёння жыццёвае здарэнне ў нешта больш значнае і высокае.***

**Віктар КАЗЬКО.**

Алесь ЛІСІЦКІ

# ДАРОГА ПРАЗ ЛЕС

Наша брыгада вяла расчыстку трасы для новай электраліміі. Выязджалі туды не ўпершыню, іншым разам нават з начлегам. Неяк пасля абеду, калі хлопцы заканчвалі работу, я вырашыў прайсці па лесе. Непадалёку ад лініі праходзіла нітка нафтаправоду, якая ў часе хады заўсёды была ў мяне злева. Я гэта добра ведаў, таму і стараўся не страціць арыенціру. Праз паўгадзіны спыніўся, агледзеўся. Гэта быў усё той жа знаёмы лес, у якім нічога не трапляла мне на вочы, што магло б зацікавіць.

Лёгкі ветрык, напоены балотным пахам, лагодзіў мне твар. Лес быў перапоўнены галасамі птушак, якіх я, жывучы ў горадзе, даўно ўжо і не распазнаю.

Хутка дарога залучыла яшчэ да адной — з каляінамі. Крочачы па ёй, я міжволі звярнуў увагу на свежыя сляды на пяску: зусім нядаўна тут прайшлі двое дарослых і падлетак. Ад няма чаго рабіць стаў прыглядацца да іх, каб прыгадаць былыя навыкі, набытыя падчас службы ў пагранвойсках.

Параўнаўшы памер свайго бота з большым следам, высветліў, што мой крыху меншы. Да таго ж па вымаху ног можна было меркаваць, што той, каму ён належаў, быў і вышэй за мяне ростам.

Такі ж памер ботаў меў і другі спадарожнік, што ішоў па каляіне побач. Але па кроках ён часціў, бо быў меншы. Сляды яго паглыбей, значыць, па целаскладу ён быў мажнейшы.

Яшчэ больш зацікавілі мяне сляды падлетка. Было відаць, што ён бег. Каб не адстаць ці таму, што спяшаўся. Я стаў прыглядацца да следу і неўзабаве заўважыў, што ў адным месцы падлетак спыніўся і сарваў некалькі кветак каля дарогі. Зацікавіцца імі магла хутчэй за ўсё дзяўчынка.

Так, цяпер я ўжо дакладна ведаў, хто не так даўно прайшоў сюдой.

Няўзнак мая ўвага да слядоў прытупела, бо пачаў сумнявацца, што іду ў правільным накірунку. Трэба было недзе павярнуць на поўдзень, як мне падалося, але ніводнай сцяжынкі ўсё не траплялася.

Неўзабаве я ўбачыў прытаптаную латку травы каля дарогі. Гэта было месца прывалу. Пешаходы спыняліся, каб распіць пляшку гарэлкі: яна валялася побач, каля рэшткаў наедку на шматку нейкай газеты.

Хоць і не вельмі, але гэта мяне насцярожыла. У такі час маглі выпіць хутчэй дзецюкі, у якіх няма ўдзень ніякага клопату.

Зноў прыгледзеўшыся да слядоў, здагадаўся, што менавіта тут дзяўчынка якраз і здагнала хлопцаў. Трава была добра прамятай, а значыць у застоллі спадарожнікі прабавіліся даўгавата і пайшлі не так даўно.

Далей сляды пачалі блытацца. Відаць, хлопцы нападпітку пачалі прыставаць да дзяўчынкі. Нейкі час яна трывала, не напалоханая іх дакучаннем. Потым усё ж пакрыўдзілася і доўга ішла ўслед. Яны спыняліся і перапрошвалі, але блізка яна не падыходзіла.

Аднак крыху пазней дзяўчо ўсё ж зноў пайшло разам з імі. Відаць, хлопцы пераканалі яе, што чапіцца не будуць. Праз паўкіламетра яны яшчэ раз прыпыняліся, каб выпіць другую пляшку гарэлкі. Прама на дарозе ляжаў папяровы корак з той жа вайсковай газеты. Праз колькі крокаў я ўбачыў і пустую пляшку каля кустоў.

Усё гэта пачало не на жарт хваляваць мяне. Чалавек нападпітку заўсёды небяспечны, а тым больш у лесе. Лёгка было здагадацца, што выпівохі задумалі нешта нядобрае.

Нечакана наперадзе пачуўся хрыплаваты брэх сабакі. Я заўважыў яго след і ведаў, што гэта была аўчарка, але думаў, што яна прабегла раней і была без гаспадара.

Брэх сабакі пачуўся зноў — бліжэй і больш выразна. Мне падалося, што я нават пачуў нейчы адчайны крык. Пайшоў шпарчэй, а потым як не подбегам. Прыгледзеўшыся да слядоў, пераканаўся, што хлопцы і сапраўды зноў дагнялі дзяўчынку. Гэта і пацвярджала маю здагадку аб іх намеры.

Неўзабаве сабака забрахаў зусім побач. Падыходзячы, я вымушаны быў прыняць меры перасцярогі. Вецер дзьмуў у мой бок, і гэта давала надзею, што аўчарка ад майго прыбліжэння адразу не насцярожыцца. Не лішнім было і ўзяць у рукі таўставатую сасновую палку, якую нехта пакінуў без патрэбы. З ёй я ўжо смялей пакрочыў туды, дзе была валтузня.

Праз некалькі крокаў я ледзьве не абамлеў ад таго, што ўбачыў: двое хлопцаў спрабавалі згвалціць дзяўчыну. У вочы кінулася іх п'яная нязграбнасць, а таксама ўпартасць ахвяры. Хоць па голасе можна было пазнаць, што сілы яе пакідаюць. Яна адбівалася то ад аднаго, то ад другога з хлопцаў, была амаль без вопраткі. Перапала ад яе і выпівохам: на парванай сарочцы таўстуна не было ўжо ніводнага гузіка.

Стала зразумелаю і прычына, чаму яны так доўга не могуць авалодаць дзяўчынай: гэтаму перашкаджаў сабака. Як толькі дзяўчына ўзнімала крык, аўчарка кідалася ёй на дапамогу і замінала хлопцам.

Нарэшце таўстун уцяміў гэта і, крыкнуўшы сябру: «Трымай мацней!», пачаў падзываць аўчарку. Яна падбегла. Ён прывязаў яе вяроўчынай, якую выцягнуў са сваёй сумкі, да дрэва — якраз паміж мной і хлопцам, што трымаў дзяўчыну. Тады ж дастаў трэцюю пляшку гарэлкі.

Я разумеў, што мне трэба крыху пачакаць. Не мог не здзівіцца загартоўцы хлопцаў: столькі выпіць у спёку можа зусім не слабак. Але тое, што сабака прывязаны і што яны вып'юць яшчэ, мяне супакоіла: з ачмурэлымі ад сівухі лягчэй і хутчэй справіцца.

Таўстун вырваў зубамі корак і сплюнуў яго ўбок. Усмак пацягнуўшы з пляшкі, нечакана заспяваў: «Один раз в год сады цветут!..» Нібы натхніўшы сябе словамі песні, падышоў да сябра, апусціўся на калені і працягнуў яму пляшку:

— На, Шэры, паддай злосці. А я пакуль на ёй патапчуся!

Было бачна, што зграбнае дзявочае цела яшчэ больш распаліла ў ім пожад.

Але я ўжо не звяртаў увагі на хлопцаў. Трымаў іх у полі зроку, а сам цішком падыходзіў да сабакі. Ён заўважыў мяне і забрахаў. Але ніхто не звяртаў на гэта ўвагі. Шэры сядзеў спінай да мяне і смактаў з горла пляшкі гарэлку. Таўстун усё яшчэ адчайна змагаўся з дзяўчынай.

Я зусім не выпадкова пайшоў да сабакі, бо яшчэ па дарозе побач са следам Шэрага заўважыў адбітак ад прыкладу стрэльбы. І не памыліўся: яна ляжала непадалёку ад сумкі.

Сабака пусціў пену, драў пярэднімі лапамі зямлю і раз-пораз кідаўся ў мой бок. Ён быў вельмі дужы — чыстапародны, без звыклай для глыбінкі помесі з дварняком.

Узяўшы ў рукі стрэльбу, я праверыў, ці зараджаная. У ствалах былі два патроны. Паглядзеў на аўчарку і нават падумаў: «Не лішнім было б і забіць цябе. Такая тут сітуацыя…» Але прамарудзіў: не асмеліўся ўзяць грэх на душу, ведаючы цану добраму сабаку.

Павярнуўшыся да хлопцаў, я ўзняў уверх стрэльбу і націснуў на курок. Грымнуў стрэл, рэха ад якога разнеслася па ўсім наваколлі. Па тым, што сабака, енчачы, не пераставаў кідацца на мяне, я адзначыў, што ён да стрэлаў прывучаны.

Хлопцы спрытнавата для падвыпітых ускочылі на ногі. Паспрабавала ўстаць і дзяўчына, але сілы ў яе хапіла толькі на тое, каб узняць галаву і паглядзець на сябе. Заплакаўшы, яна павярнулася на правы бок і лягла на зямлю.

Хлопцы пераглянуліся паміж сабой. Таўставаты, сплюнуўшы праз металічны зубы, п'яна рыкнуў:

— Шэры, адкуль узялася яшчэ і гэтая падла?!

***(Заканчэнне на 8-й стар.)***

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд (2 чэрвеня). Па гарызанталі:** Агрэст. Капёр. Хамса. Спа. Ірыс. Муха. Амар. Слуп. Леру. Злёт. Мухамор. Ас. Чынш. Крэп. Астат. Арама. Апалонік. Док. Атара. Рыф. Саамі. «Спартак». Баку. Тытан. Сяляне. **Па вертыкалі:** Тормаз. Кандэнсат. Каса. Астача. Арба. Сыта. Ратан. Тэхнікум. Прымак. Пунш. Фікус. Ала. Сала. Крот. Прас. Мембрана. Пуаро. Эмір. Рэпа. Рур. Паказанне.

Алесь ЛІСІЦКІ

# ДАРОГА ПРАЗ ЛЕС

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 5-й стар.)*

Без ніякай дамовы яны пайшлі на мяне. Я паспеў разабраць стрэльбу і на вачах у іх па частках раскідаў далёка па балоце. Гэта сябрам вельмі не спадабалася.

Шэры дзіка вышчарыўся і прахрыпеў:

— Джон, ён прынясе яе нам у зубах!

— Калі яны ў яго застануцца! — рагатнуў сп'яна Джон.

Паміж намі было не больш пяці—шасці крокаў. Мой рост і ўзрост не выклікалі ў хлопцаў ніякай павагі. Не было страху перад імі і ў мяне. Яны былі, як кажуць, цёпленькія, а я некалі крыху займаўся яшчэ і барацьбой.

Узяўшы ў рукі палку, я папярэдзіў:

— Не будзьце, хлопцы, прыткімі. Пра свае зубы я патурбуюся сам.

— Гэты прыдурак, Джон, нешта яшчэ і вякае! — зазлаваў на мае словы Шэры.

— Я казаў, што дабра ён не ўбачыць! — падтрымаў яго Джон.

Як потым высветлілася, я недааацаніў сваіх сапернікаў. Нейкімі навыкамі барацьбы яны таксама валодалі. Першым ударыць нагой мне ў грудзі вырашыў Шэры. Разгадаўшы ягоны намер, я адскочыў улева. Калі ён замахнуўся яшчэ раз, я апярэдзіў і канчаром палкі лупянуў яму ў пах. Ён войкнуў і ўпаў на калені.

Таўстун, відаць, ніяк не чакаў такога павароту падзей, але рынуў напрасткі да мяне. Справіцца з ім было нават прасцей, бо ён лёгка прапусціў мой «хук». Да таго ж я агрэў яго палкай яшчэ па руках і спіне. Войкаючы, Джон хапаўся то за руку, то паціраў сківіцу.

Я не стаў біць іх моцна, даючы магчымасць адумацца і не пароць гарачкі. Захацеў нават праверыць іх — ступіў некалькі крокаў убок, пакінуўшы Шэрага за спіной. Пры спробе атакаваць ён быў бы асляплены сонцам.

Так яно і было: ззаду адразу ж пачуўся паспешлівы тупат. Зрабіўшы выпад з прысестам управа, я падставіў Шэраму палку прама пад ногі. Ён спатыкнуўся і плазам лёг на зямлю перад Джонам. Той кінуўся яму на дапамогу.

Тады я зноў сказаў:

— Хопіць, хлопцы, пажартавалі. Падумайце, што вы робіце. Яшчэ не позна. Інакш будзе вельмі блага!

— Рана, гад, пасмялеў! Бачылі і не такіх ганарліўцаў! — не змаўчаў у адказ на маё папярэджанне Шэры.

— Ох, паплачаш, байструк, ох, паплачаш! — падтрымаў яго Джон.

Відаць было, што яны ўспрынялі маю прапанову за няўпэўненасць у сабе і сваіх сілах. Таму і рушылі зноў на мяне. На гэты раз у абход. Чакаць я не стаў, а сам скочыў у бок да Шэрага. Ён гэтага зусім не чакаў, на момант спыніўся і нават прысеў. Тады ўжо зусім без шкадобы я выцяў яму палкаю на самай хрыбеціне. Шэры, як мех, асеў на зямлю. Уражаны такім маім спрытам, Джон хацеў прыпусціць наўцёкі. Мне не заставалася нічога, як наўздагон сцебануць яму па нагах.

Енчачы ад болю, хлопцы качаліся па зямлі.

Я ведаў, што малады арганізм хутка вяртае сілы, таму і не стаў марудзіць. Падбег да дзяўчыны. Спатрэбіўся нейкі час, каб яна ачуняла. Калі яна села, я накінуў ёй на плечы свой пінжак і спытаў, як яе завуць.

Яна вельмі ціха прамовіла:

— Надзея.

Каб хоць неяк узняць ёй настрой, прымусіў сябе пажартаваць:

— Ну што ж, дачушка, тады на цябе і ўсе мае надзеі!

Дапамогшы ёй устаць, папрасіў:

— Знайдзі сілы і хоць крыху прабяжы наперад.

Па тым, як яна зрабіла першы крок, я пераканаўся, што мая надзея на яе не вельмі вялікая. Таму падхапіў на рукі і пайшоў наперад. Але крокаў праз сто вымушаны быў паставіць яе на ногі. Стома і нервовая напружанасць усё ж давалі аб сабе знаць — у мяне перацяла дыханне.

Тады ж ззаду ў нас пачуўся зласлівы брэх. Так паводзіць сябе толькі прывучаны браць след сабака. Цяпер я нават пашкадаваў, што не прыстрэліў яго.

Адвёўшы дзяўчыну пад невысокую хвойку, загадаў:

— Стой тут і нічога не бойся! Нам адступаць няма куды.

Аўчарка была ўжо метраў за трыццаць ад нас, ішла верхнім чуццём.

Надзея сабакі не бачыла. Заўважыўшы маю насцярожанасць, з трывогай спытала:

— Што там?

— Сабака! — адказаў я як мага спакайней.

Яна войкнула і прысела. Суцяшаць яе не было калі. Трэба нешта рабіць: нацкаваны гаспадаром, сабака быў нашым самым лютым ворагам. Асабліва для яе, напаўсамлелай дзяўчыны.

Па паводзінах сабакі я зразумеў: ён нас пачуў. Не марудзячы, пабег насустрач аўчарцы. Гэта было апраўдана, бо ў высокай траве пачынаць бойку нязручна і рызыкоўна.

Калі сабака быў ужо гатовы кінуцца на мяне, я зрабіў крок назад, падскочыў і, крутнуўшыся ў паўабарота, з маху выцягнуў штомоцы палкай яму па спіне. Мне нават пачулася, як храснуў яго пазванок.

Сабака віскнуў ад болю і кульнуўся ў той бок, дзе стаяла Надзея. Ад нечаканасці і страху дзяўчына ледзьве не ўпала, адчайна ўскрыкнуўшы.

Дабіваць аўчарку не было ніякай патрэбы. Яна нават паспрабавала ўстаць на ногі, але не змагла.

Выйшаўшы на дарогу, мы азірнуліся і ўбачылі зусім побач Шэрага і Джона.

— Што, старац, захацеў свежанінай пацешыцца? Не атрымаецца! — гучна выкрыкнуў зноў пасмялелы Шэры.

Надзея была белай, нібы палатно. Глянуўшы на яе, я зразумеў, што нашы пакуты яшчэ не скончаны: яна не зможа ўцячы, нават калі я і затрымаю тут хлопцаў. Вось і адвёў яе далей ад дарогі.

Хлопцы падышлі да сабакі. Ён яшчэ раз паспрабаваў устаць: не атрымалася. Тады сабака жалосна і вінавата енкнуў, гледзячы Шэраму ў вочы і нібы просячы прабачэння за нямогласць і няздольнасць дапамагчы ў гэты скрутлівы момант.

Хлопцы ўсё зразумелі і з яшчэ большай нянавісцю зыркнулі на мяне. На гэта я зусім спакойна ім патлумачыў:

— У мяне не было больш выйсця. Я папярэджваў, што ўсё гэта дрэнна скончыцца. Вы мяне не паслухалі.

Шэры з пагардай у вачах скінуў з сябе сарочку і рашуча ступіў наперад:

— Ну што ж, падла, ты свой выбар зрабіў. Цяпер крыўдуй на сябе. За аўчарку ты вельмі многа заплаціш!

Для манеўру адступіўшы назад, я паглядзеў на Надзею. У яе вачах цяпер быў ужо нават не страх, а нейкі дзікунскі жах. Ёй хацелася закрычаць, але нечым была так напалохана, што змагла толькі прыкрыць рот крысом майго пінжака.

Нічога не разумеючы, я перавёў свой позірк на хлопцаў. У іх вачах свяцілася такая ж загадкавасць.

У гэты ж самы момант нехта халодную руляй стрэльбы тыркнуў мне ў спіну і зычна крыкнуў:

— Стаяць, сволач!

Толькі цяпер я і зразумеў, чаму Надзея была разгубленаю. Яна яшчэ раней заўважыла таго, хто, пагражаючы ёй стрэльбаю, стаяў у мяне за спіной.

Па тварах хлопцаў я здагадаўся, што гэта быў іх сябра. Відаць, пра яго яны і згадвалі, спрабуючы згвалціць дзяўчыну: «Шкада, што няма Сцёпкі. Ёсць чым паласавацца!».

Сябра чакаў іх у раней дамоўленым месцы. Бачачы, што хлопцы позняцца, а таксама пачуўшы стрэлы, паспяшаў насустрач і на дапамогу.

У мяне зноў не было выбару. Чакаць разборкі не выпадала: яны ўтрох і маладзейшыя. Скарыстаўшы момант, я прысеў, крутнуўся і ўдарыў палкай па стрэльбе, якая мне пагражала.

Грымнуў стрэл. Ззаду нехта пранізліва войкнуў.

Другім ударам я выбіў зброю з рук у хлопца ў егерскай форме.

Закінуўшы назад галаву і прыкрываючы рану рукой на назе, за спіной у мяне ляжаў Шэры.

Падняўшы стрэльбу і трымаючы яе напагатове, я загадаў Джону і егеру:

— Дапамажыце яму!

Пакуль хлопцы перавязвалі параненага, мы з Надзеяй сталі ўбаку і чакалі.

Нечакана з-за павароту выехаў на параконцы дзядзька. Яму нічога тлумачыць не трэба было.

Шэрага і сабаку палажылі на воз. Надзея сесці з імі не захацела. Да бліжэйшай вёскі крочыла побач, трымаючы мяне за руку.

Па дарозе мне расказала. Яшчэ зранку яна прасілася ў маці схадзіць да цёткі ў суседнюю вёску. Маці доўга ўпарцілася. Пасля абеду, пачуўшы, што ў Болева пайшлі Сяргей Чорны і ягоны сябрук Іван Пыж, нарэшце дазволіла Надзеі пайсці ўслед за хлопцамі. Хто ж ведаў, што нападпітку і з запасам гарэлкі яны выправіліся на сустрэчу з былым саслужыўцам — егерам Сцяпанам Еўчыкам. Па дарозе выпашылі выпіць яшчэ, а потым і захацелі пацешыцца — дзяўчо ж само напрасілася.

У Болеве я адразу выклікаў «хуткую дапамогу» і пазваніў у райаддзел міліцыі...

*г. Старыя Дарогі.*

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.39 | 21.39 | 17.00 |
| Віцебск — | 4.21 | 21.37 | 17.16 |
| Магілёў — | 4.29 | 21.29 | 17.00 |
| Гомель — | 4.35 | 21.16 | 16.41 |
| Гродна — | 4.56 | 21.52 | 16.56 |
| Брэст — | 5.06 | 21.44 | 16.38 |

### Месяц

*Апошняя квадра*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Фядора, Івана, Купрыяна, Ніла, Фёдара*
***К.*** *Ганны-Марыі, Пелагеі, Ахрамея, Рычарда, Станіслава, Феліцыяна*

По звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

**Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці**

| | 9 чэрвеня | 10 чэрвеня | 11 чэрвеня |
|---|---|---|---|
| Для бязвоблачнага неба | UV INDEX 6,4 | UV INDEX 6,4 | UV INDEX 6,4 |
| З улікам прагназуемай воблачнасці | UV INDEX 5,8 | UV INDEX 5,8 | UV INDEX 5,8 |

Экстрэмальны ...... 11+
Вельмі высокі .... 8—10
Высокі .................. 6—7
Умераны ............... 3—5
Нізкі ...................... 1—2

З 11 да 15 гадзін дня час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры:
09.06 — 15 мінут,
10.06 — 15 мінут,
11.06 — 15 мінут.

## Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +23 — +25 °С | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +24 — +26 °С | Без ападкаў |
| КІЕЎ | +24 — +26 °С | Без ападкаў |
| МАСКВА | +16 — +18 °С | |
| РЫГА | +21 — +23 °С | Без ападкаў |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | +14 — +16 °С | Без ападкаў |

## Дзве даты — 9 чэрвеня



**1812 год** — на базе Полацкага іезуіцкага калегіума заснавана Полацкая іезуіцкая акадэмія. У сувязі з вайной 1812 года заняткі пачаліся толькі ў студзені 1813 года. У адпаведнасці з царскім указам, акадэміі былі нададзены правы ўніверсітэта. Яна мела тры факультэты — тэалогіі, філалогіі і філасофіі, на якіх навучалася больш як 7 000 студэнтаў. Сярод выпускнікоў акадэміі былі пісьменнік Я. Баршчэўскі, жывапісец В. Ваньковіч і іншыя вядомыя дзеячы навукі і культуры. Праіснавала да 13 сакавіка 1820 года, калі на тэрыторыі Расіі была забаронена дзейнасць ордэна іезуітаў.

**1943 год** — чэшскі пісьменнік, журналіст, грамадскі дзеяч Юліус Фучык зрабіў апошні запіс у сваім турэмным дзённіку: «Людзі, будзьце пільнымі!» (выдадзены кнігай «Рэпартаж з пятлёй на шыі» ў 1945 г.). Праз некалькі дзён ён будзе пакараны ў берлінскай турме «Плетцэнзе».

**Цытата дня:**

***«Мужчынскі свет — гэта гадзіннік, гіры якога — грошы, а маятнік — жанчыны».***

**Лесінг Готхальд Эфраім (1729—1981), нямецкі драматург.**

## НЕПАДКУПНЫ НАРАД

Няўдалай аказалася спроба грамадзянкі Латвіі падкупіць беларускіх памежнікаў. Як паведамілі ў прэс-цэнтры Дзяржкамітэта пагранічных войскаў нашай краіны, жанчына ехала ў цягніку з Расіі ў Літву. Грамадзянка Латвіі не мела беларускай транзітнай візы. Таму, каб «улагодзіць» нашых памежнікаў у пункце пропуску «Гудагай-1», яна разам з дакументамі «прад'явіла» пагранічнаму нараду 100 долараў. Вартавыя беларускай мяжы грошай не ўзялі, а вось хабарадаўцу затрымалі і перадалі супрацоўнікам міліцыі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## Усміхнёмся!

Адэса, пасажыры лезуць у перапоўнены трамвай. Жаночы голас, гучна на ўвесь трамвай:

— Соня, ты ўвайшла?! Соня!

Мужчынскі голас:

— Яна яшчэ як увайшла! Яна мне ўжо тры разы на нагу наступіла!

☺

**Фразы для гасцей кшталту: «А зараз я пакажу вам наш сямейны альбом!» ці «Паглядзіце, як вучыцца наш сын!» значна зэканомяць прадукты і выпіўку.**

☺

Прыходзіць мужык на працу з фінгалам. Яго пытаюцца, што здарылася. Адказ:

— Ды жонка ўрэзала...

— За што?

— Ды я яе на ТЫ назваў.

— Дык за гэта ж не б'юць. А як справа была?

— Ды ляжым у ложку. Яна мне кажа: «Нешта МЫ даўно сэксам не займаліся». А я ёй адказваю — «Не МЫ, а ТЫ...»

☺

**— Ты хто па прафесіі?**
**— Ландшафтны дызайнер.**
**— Цікава!**
**— Так, на бульдозеры працую...**

☺

На вуліцы да маладога мужчыны падыходзіць прыгожая жанчына.

— Выбачайце, — кажа яна, — але мне здаецца, што вы бацька аднаго з маіх хлопчыкаў...

Мужчына (жахліва):

— Я?!

— Не хвалюйцеся, я настаўніца вашага дзіцяці.

☺

**— Здароў, сусед, як там ваша немаўля?**
**— Ды малы добра. А вось на нас недахоп сну вельмі моцна адбіваецца. Дрэнна сябе адчуваю.**
**— А як Лена?**
**— Лена — гэта я! Генка выглядае яшчэ горш...**




Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Скарпіёнам трэба берагчыся зорнай хваробы, а Стральцам — канфліктаў з начальствам



**АВЕН.** Ваша манера ставіць людзей перад фактамі, якія ўжо здзейсніліся, пакідае ім не так шмат прасторы для праявы ініцыятывы. У сераду не варта ісці на повадзе ў асабістай самаўпэўненасці і эгаізму, калі хочаце пазбегнуць непатрэбных непрыемнасцяў. У другой палове тыдня вас чакае пазітыў у адносінах з дзелавымі партнёрамі, але сямейныя справы могуць выклікаць неспакой. Варта надзяляць дому больш часу. У чацвер і пятніцу прыслухайцеся да парадаў і выпадковых падказак, агучаных калегамі.

**ЦЯЛЕЦ.** Варта ўнутрана сабрацца, каб не прапусціць важных падзей. Калі зробіце сабе паблажку і будзеце ленавацца, то рызыкуеце згубіць шанц. На рабоце начальства можа нават не звярнуць увагі на вашу незацікаўленасць у выніку працы. Аднясіцеся да сябе крытычна. Нягледзячы на мноства планаў, можаце адчуць некаторую апустошанасць. Сканцэнтруйцеся на галоўных справах. Пастарайцеся прадставіць свае ідэі ў прафесійнай галіне — яны могуць быць запатрабаваны. Спатрэбіцца дапамога бацькам. У канцы тыдня можаце атрымаць запрашэнне ад старых сяброў — і добры настой будзе забяспечаны.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень прынясе новыя жыццёвыя ўстаноўкі. Старайцеся не губляць каштоўны час дарэмна. Усё задуманае зможа ажыццявіцца, калі вы спакойна і дакладна будзеце рабіць сваю справу. Не варта пачынаць новых спраў у панядзелак: у гэты дзень лепш нават нічога не планаваць. Перш чым складаць план дзеянняў, праверце надзейнасць партнёраў. У другой палове тыдня можаце адчуць, што на многае здольны. Не спяшайцеся растрачваць сілы. Пастарайцеся стварыць камфортную абстаноўку дома. Не варта пачынаць рамонт ці праводзіць сур'ёзныя змяненні ў абстаноўцы, а таксама высвятляць адносіны з блізкімі.

**РАК.** З'явіцца жаданая свабода дзеянняў. Але ёй неабходна разумна распарадзіцца. У сераду анархічны настрой і заваяванне незалежнасці любой цаной можа прынесці расчараванне і непатрэбныя страты. У суботу пастарайцеся сачыць за сваімі словамі: перш чым сказаць штонебудзь, падумайце. Пастарайцеся быць больш праўдзівымі з сабой і навакольнымі. Нядзеля можа стаць цудоўным днём для адпачынку і асабістых перамог.

**ЛЕЎ.** Вы азадачылі сябе занадта грандыёзнымі планамі? Магчыма, лепш скараціць іх, аб'ектыўна ацаніўшы свае сілы. Верагодны камандзіроўкі ў панядзелак ці суботу, яны дазволяць адцягнуць увагу ад праблем. Вашы дасціпныя выказванні могуць справакаваць канфліктную сітуацыю, таму сачыце за сваімі словамі. У нядзелю, вырашаючы важныя пытанні, прыслухайцеся да парад блізкіх і не адмаўляйцеся ад іх дапамогі.

**ДЗЕВА.** Надышоў спрыяльны час для пазітыўных пераменаў. Адкіньце прэч няўпэўненасць і сумненні і пачынайце адстойваць свае правы на ўсіх жыццёва важных накірунках. У пачатку тыдня тайныя праблемы стануць яўнымі, што паспрыяе іх тэрміноваму вырашэнню. У чацвер можаце сутыкнуцца з наступствамі сваіх памылак у мінулым — не варта адчайвацца з гэтай нагоды. У нядзелю можа ўзмацніцца ваш асабісты ўплыў, а сябры ці родныя папросяць дапамагчы ў цяжкавырашальнай сітуацыі.

**ШАЛІ.** Панядзелак і аўторак пройдуць у размеранай спакойнай абстаноўцы, што дазволіць завяршыць хоць бы тыя справы, якія нельга адкласці. Пачынаючы з серады, падзеі пачнуць набываць асаблівую важнасць. Не выключана, што яны адкрыюць для вас бліскучыя перспектывы і ў справах, і ў асабістым жыцці. Павышаная нагрузка падасца вам непасільнай, але хутка вы адчуеце, як адкрыецца другое дыханне. У суботу пазнаёміцеся з новымі людзьмі.

**СКАРПІЁН.** Зможаце заняць актыўную пазіцыю ў якасці дарадчыка па розных пытаннях і прафесіянала ў розных галінах дзейнасці. Але ёсць небяспека падхапіць зорную хваробу ў асабліва цяжкай форме. Вашы дасягненні на ўзроўні разважанняў неабходна пацвердзіць практыкай. Магчымасць зрабіць гэта будзе ў вас на працягу ўсяго тыдня. Субота прыдатная для адпачынку разам з сям'ёй. Гэты занятак нават прынясе вам задавальненне, калі вы самі не пастараецеся ўсё сапсаваць, спрабуючы навязаць навакольным свой пункт гледжання.

**СТРАЛЕЦ.** Варта знайсці час для пашырэння сваіх прафесійных ведаў. Кожны новы навык, набыты зараз, можа быць запатрабаваны літаральна з мінуты на мінуту. Удалы тыдзень для развіцця кар'еры, паездак і камандзіровак. Галоўнае — пазбягайце канфліктаў з начальствам. У пачатку тыдня пастарайцеся выкраіць крыху часу для блізкіх.

**КАЗЯРОГ.** Шматабяцаючы творчы тыдзень. Аднак калі вы хочаце ўстроіцца на работу, то гэты час зусім не падыходзіць. Пачынаючы з аўторка, праявіце ініцыятыву і актыўнасць: вашы ідэі будуць прынятыя і падтрыманыя начальствам і калегамі па рабоце. У гэты дзень можаце атрымаць важную інфармацыю — пастарайцеся яе не прапусціць. Паездкі лепш планаваць на пятніцу. У нядзелю верагодна нефармальная сустрэча: ад яе будуць залежаць многія бліжэйшыя падзеі ў дзелавой галіне. Сітуацыя ў гэты дзень спрыяльная і поспех практычна гарантаваны.

**ВАДАЛЕЙ.** У пачатку тыдня можаце адчуць незадаволенасць вышэйстаячых. Хутчэй за ўсё, начальству не спадабаюцца вынікі вашай працы. Але прэтэнзіі будуць абгрунтаванымі, таму запасайцеся цярпеннем і ўважліва выслухайце, што вам гавораць. Як мінімум — пакажыце раскаянне і перажыванне. У сераду, калі эмоцыі прыціхнуць, можа паступіць інфармацыя, якая адкрые перад вамі новыя перспектывы і далягляды. Гэта самы насычаны падзеямі дзень на гэтым тыдні. Сітуацыя спрыяльная для правядзення вынаходніцкай дзейнасці: не выключана, што вам удасца нават зрабіць адкрыццё. Сябры парадуюць сваёй увагай, цудоўна будуць складвацца прыяцельскія адносіны. Пастарайцеся не рызыкаваць без крайняй неабходнасці, асабліва ў чацвер. У суботу адпачніце ад усіх клопатаў на свежым паветры за горадам ці ва ўтульнай абстаноўцы.

**РЫБЫ.** Калі заглушыце ў сабе залішні скептыцызм і празмерную разважлівасць, справы пойдуць на лад. Тады зможаце адкрыць для сябе цікавыя прапановы. Больш прыслухоўвайцеся да голасу інтуіцыі. У пачатку тыдня, асабліва ў панядзелак, давядзецца адстойваць свае пазіцыі. Хутка прынятае ў сераду рашэнне будзе спрыяць вынікам, якія парадуюць вас. У сярэдзіне тыдня вас можа чакаць павышэнне па службе або прэмія. Блізкі чалавек можа прыгатаваць прыемны сюрпрыз.

## ВЫСТАВА ДЛЯ ХУЛІГАНАЎ

**Турма брытанскага графства Йорк наладзіла выставу, каб паказаць парушальнікам грамадскага спакою, якое пакаранне за свае ўчынкі яны маглі атрымаць некалькі соцен гадоў таму. Спецыяльнага для гэтага ўваход уладальнікам забарончых прадпісанняў у адносінах антысацыяльных паводзінаў (ASBO) быў зроблены бясплатным.**

Практыка выдачы забарончых ордэраў праводзіцца ў Вялікабрытаніі з 1999 года. З таго часу з кожным годам колькасць забарон няўхільна расце. Кампетэнтныя органы могуць выдаць распараджэнне, якое забараняе канкрэтнай асобе займацца якой-небудзь канкрэтнай дзейнасцю. Напрыклад, прафесійнаму ўгоншчыку аўтамабіляў забараняецца з'яўляцца на паркоўках. «Мы хочам паказаць, што за злачынствы, якія ўчыняюць гэтыя людзі, калісьці высылалі і нават, у XVIII стагоддзі каралі смерцю, — расказвае менеджар турмы Хелен Дуглас. — Хоць я ні ў якім разе не выступаю за вяртанне гэтых мераў, усё ж такі наша выстава павінна шакіраваць уладальнікаў ASBO і паказаць ім, што магло з імі адбыцца, калі б жылі яны пару стагоддзяў таму».

## СЛОН-ВЫМАГАЛЬНІК

**Вадзіцелі штата Арыса, што на ўсходзе Індыі, скардзяцца на слана-вымагальніка, які блакіруе дарожны рух. Жывёла патрабуе ў вадзіцеляў ежу ў абмен на магчымасць праехаць.**

Паводле слоў мясцовага жыхара Прабодха Маханці, калі слон перакрывае шашу, вадзіцелі апускаюць шкло і выходзяць са сваіх аўто. Скарыстаўшыся гэтым, жывёла з дапамогай хобата абшуквае салон у пошуках ежы. «Калі ён знойдзе агародніну ці бананы, прыйдзецца аддаць іх яму, тады зможа ехаць далей», — скардзіцца індыйскі аўтааматар. Прадстаўнікі мясцовых уладаў тлумачаць, што слон стары і таму спрабуе здабыць сабе ежу такім лёгкім чынам. Яны раяць адносіцца да жывёлы цярпіма, паколькі яна нікому не наносіць шкоды.

## НЕСАПРАЎДНЫ МУЖ

**Вышэйшы суд пакістанскага горада Лахор прыгаварыў мужа і жонку да 3 гадоў турэмнага зняволення за тое, што яны ўтойвалі сапраўдны пол аднаго з сямейнай пары.**

## Inter-ПОЛ

Як было ўстаноўлена ў судзе, 31-гадовы Шумаіл Радж, які называў сябе мужчынай, на самай справе жанчына, якая змяніла пол з дапамогай пластычнай аперацыі. Як сказаў выкрыты «муж», яго 24-гадовая жонка Шэзіна Тарык ведала пра аперацыю і пагадзілася сыграць з ім вяселле, «таму што баялася, што яе выдадуць замуж за кагосьці іншага». Крымінальная справа ў адносінах да мужа і жонкі была ўзбуджана пасля таго, як Радж звярнуўся ў суд з просьбай абараніць яго ад абраз сваякоў, якія былі не ў захапленні ад жаніцьбы. У Пакістане, мусульманскай краіне, дзе рабіць аперацыі па змене полу катэгарычна забаронена законам, падобныя дзеянні строга караюцца.

## ЖАНЧЫНУ АДКЛЮЧЫЛІ АД АПАРАТА ЗА ДОЎГ

**Жыхарка Новай Зеландыі Флоле Муліяга памерла пасля таго, як кампанія Mercuru Energy адключыла за даўгі электрычнасць у яе доме, што прывяло да спынення дзеяння кіслароднага апарата, якім яна карысталася для падтрымання дыхання і працы сэрца.**

Кампанія накіравала ў дом Муліягі свайго супрацоўніка, якому было загадана адключыць падачу электрычнасці. Паводле слоў адваката сям'і Бернарда Шэрыдана, Флоле спрабавала патлумачыць тэхніку, што электрычнасць неабходна для кіслароднай машыны. Нягледзячы на гэта ён абясточыў дом, спаслаўшыся на тое, што проста робіць сваю працу. А праз чатыры гадзіны жанчына, якая з'яўляецца маці чатырох дзяцей, памерла. Паліцыя пакуль занята вывучэннем усіх акалічнасцяў таго, што адбылося, аднак не выключана, што сям'я нябожчыцы зможа запатрабаваць узбуджэння крымінальнай справы. Са свайго боку прадстаўнікі кампаніі заявілі, што Муліяга не сказала тэхніку пра тое, што адключэнне электрычнасці можа ўяўляць пагрозу яе жыццю. Яны адзначылі, што ў кампаніі ёсць спецыяльны спіс кліентаў, якім неабходна электрычнасць для лячэбна-медыцынскіх мэтаў, аднак імя Муліягі ў ім не фігуруе.

**Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.660. Індэкс 63850. Зак. № 3128. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12